№ 27 (625) 22 ліпеня 2009

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Палітбюро-2009: Міхаіл Мясніковіч**

Старонка 8

**Вядзьмарскія працэсы ў ВКЛ**

Старонка 12

**Міс Грудзі і містэр Пеніс**

Старонка 6



## У НУМАРЫ

**У піку Крамлю Лукашэнка асядлаў «Харлей-Дэвідсан»**

Піша Аляксандр Класкоўскі.
**Старонка 5.**

**Улады прыйшлі да Макоўскай**

Міністр Латушка і ўпаўнаважаны Гуляка ўпершыню прысутнічалі на З'ездзе беларусаў свету.
**Старонка 7.**

**Павалілі і білі па галаве**

Штомесячная акцыя салідарнасці з палітвязнямі і сем'ямі зніклых 16 ліпеня скончылася затрыманнямі і збіццём удзельнікаў.
**Старонка 3.**

**Басовішча ў рэжыме эканоміі**

Арганізатары ашчаджалі на ўсім. Затое гледачы папрыязджалі на BMW. Рэпартаж Сямёна Печанка з Басовішча-2009.
**Старонка 11.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Лато ці лахо?

Латарэйная кампанія «Спорт–пары» хутка даганяе «Суперлато». Акцыянерам першай з'яўляецца Прэзідэнцкі спартовы клуб Дзмітрыя Лукашэнкі. Другой кіруе былы муж Наталлі Пяткевіч. **Старонка 4.**




KILGORTRAUTT.LIVEJOURNAL.COM




## Пераадкрыццё Беларусі

Новая кніга прафесара гісторыі Алега Латышонка. **Старонка 15.**

# Што дазволена Юпітэру, не дазволена Дзямку

**Паводле кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Уладзіміра Макея, клан Дзямко апанаваў Столінскі раён. Цяпер справа набывае крымінальны паварот.**

Шырокі розгалас апошнім часам атрымала справа «клана Дзямко». Яшчэ 20 траўня кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей правёў нараду, якая датычыла пытанняў пратэкцыянізму і сямейнасці ў шэрагах улады. Сярод іншага тады быў агучаны выпадак сям'і Дзямко з Столінскага раёну.

Макей адзначыў, што складаецца ўражанне, нібыта ўся ўлада ў раёне прыватызаваная адной сям'ёй. Аляксей Дзямко ўзначальвае райвыканкам, яго сын — аддзел райвыканкаму па справах моладзі, сват — старшыня СВК «Палеская ніва», сястра жонкі — старшыня мясцовага савету дэпутатаў, брат — старшыня назіральнай рады СВК «Фядорскі».

«Узнікае заканамернае пытанне: куды глядзяць аблвыканкамы і памочнік прэзідэнта? Чаму няма рэакцыі на падобныя факты?» — абураўся Макей. Ён запатрабаваў «даць самую прынцыповую ацэнку чыноўнікам, якія займаюцца такой кадравай палітыкай».

Адразу ж праверкай фактаў занялася Генеральная пракуратура. Тым не менш, амаль два месяцы Аляксей Дзямко ціха і спакойна працягваў займаць сваю пасаду, як і іншыя яго свякі.

І вось у пачатку гэтага тыдня з'явілася інфармацыя, што супраць Аляксея Дзямко і ягонага роднага брата Рыгора, былога дэпутата Палаты прадстаўнікоў, заведзеныя крымінальныя справы. Па інфармацыі інтэрнэт-выдання «Ежедневник», справы распачалі яшчэ два тыдні таму, але інфармацыя пра іх не распаўсюджвалася. У Генеральнай пракуратуры не даюць каментароў адносна гэтых справаў, кажучы, што ўсё ж гаворка вядзецца пра людзей, унесеных Лукашэнкам у кадравы рэестр.

**Старшыня Столінскага райвыканкаму Аляксей Дзямко: «Нікога я не ўладкоўваў»**

Брата я нікуды не ўладкоўваў, ён кіраўнік адной з найбуйнейшых сельскіх гаспадарак у краіне. Сам старшынём 32 гады працуе. Астатнія ж сваякі — у Расіі.

**Працяг на старонцы 3.**

# Чарговая спроба змяніць імідж Лукашэнкі

Праігнараваўшы запрашэнне Мядзведзева на традыцыйныя скачкі, Аляксандр Лукашэнка ачоліў калону байкераў у суботу. Такім чынам кансерватыўны конны спорт стаў на адны шалі з «Harley Davidson», амерыканскім сімвалам свабоды. Што гэтым разам задумалі піяршчыкі беларускага прэзідэнта?

З моманту першага з'яўлення ў 1953 годзе матацыклу «Harley Davidson» у фільме Стэнлі Крамера пра байкераў-крымінальнікаў «Дзікі» (The Wild One) імя «Harley Davidson» і гэтых матацыклаў трывала асацыюецца са свабодным ладам жыцця і непрызнаннем законаў. А сапраўднай легендай «Harley Davidson» стаў пасля выхаду ў 1963 годзе фільму «Бесклапотны яздок» (Easy Rider), гісторыі двух сяброў, якія вандруюць па ЗША на матацыклах у пошуках сапраўднай свабоды. Гэты фільм зрабіў матацыклы «Harley Davidson» сімвалам свабоды.




Піяршчыкі Лукашэнкі скапіявалі галівудскі тыпаж.

А вось элітны конны спорт, адно з самых распаўсюджаных хобі каралеўскіх сем'яў па ўсім свеце, з'яўляецца хутчэй сімвалам супрацьлеглым. Ён увасабляе сабой традыцыі манаршых сем'яў і кансерватыўны лад жыцця. У святле апошніх памкненняў беларускага прэзідэнта на Захад зразумела, чаму ён спыніў выбар менавіта на прапагандзе ліберальных каштоўнасцяў. Праўда, асядлаўшы матацыкл коштам як мінімум 32 тысячы еўра, Лукашэнка наўрад ці стаў бліжэйшы да народа, які ніколі не ацэньваў дарагія «цацкі» прадстаўнікоў улады. Затое «Харлей» маглі ацаніць самі байкеры, якія ў большасці з'яўляюцца паспяховымі людзьмі, ды моладзь, якую цікавяць дарагія матацыклы. А, як вядома, менавіта ў прадстаўнікоў бізнэсу і моладзі Лукашэнка мае не найлепшую рэпутацыю.

Падчас «Байкер-шоў-2009» «засвяціўся» з «Харлеем» і прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін. У пазамінулы аўторак ён прыехаў у Севастопаль правесці ў дарогу маскоўскіх байкераў. Падчас сустрэчы з байкерамі ён прызнаўся, што ў ягоным гаражы стаіць уласны «Harley Davidson». Але, у адрозненне ад беларускага кіраўніка, убачыць расійскага прэм'ера, які катаецца на матацыкле, можна толькі на старых здымках.

Ёсць «Харлей» і ў прэзідэнта Украіны Віктара Юшчанкі. У дэкларацыі за 2008 год ён напісаў, што мае «Запарожац», які ў народзе празвалі «гарбаты» і рарытэтны матацыкл «Harley Davidson» 1942 года выпуску. Матацыкл кіраўніку Украіны падаравала яго жонка Кацярына да свята Новага году.

Дарэчы, Аляксандр Лукашэнка ў сваёй дэкларацыі аб прыбытках таксама ўказаў матацыкл — «Мінск» 1992 года выпуску. Але пагаворваюць, што «Harley Davidson Ultra Classic Electra», на якім ён катаўся ў суботу, таксама належыць яму.

Новы вобраз Лукашэнкі з «унікальным» сынам на руках — даволі рызыкоўны ход, улічваючы тое, наколькі тонкая мяжа паміж вялікім і смешным.

**Вольга Жарнасек**

Каментар Аляксандра Калскоўскага — **старонка 5.**

# МВФ: Беларусь мае крэдытаў досыць

Місія МВФ у Беларусі заявіла, што Мінск не мае патрэбы ў дадатковым замежным фінансаванні. Крэдытаў, што былі выдадзеныя ці паабяцаныя на сёння, хапае. Гэтыя словы прадстаўніцы Фонду ў Беларусі Наталлі Калядзінай цытуе агенцтва Reuters.

У той жа час, на думку Калядзінай, Беларусі цяжка было б абысціся без ужо запланаваных пазычанняў. Як вядома, 500 млн даляраў абяцала Мінску Расія. Яшчэ 600 мільёнаў краіна можа атрымаць у якасці восеньскае траншы МВФ. Калі з апошнім праблемаў не чакаецца, то Масква выдачу крэдыту прыпыніла.

На думку эканамісткі, беларускаму ўраду цяпер варта сканцэнтравацца на прыватызацыі і спрашчэнні падатковай сыстэмы. У прыватнасці, МВФ падтрымлівае ініцыятыву ўраду падвысіць стаўкі падатку на дададную вартасць, а ўзамен ліквідаваць шэраг дробных падаткаў.

Заява МВФ будзе мець значэнне пры разглядзе чарговых просьбаў пра крэдыты Расіяй і Еўрасаюзам. Адпаведныя запыты да іх былі адпраўленыя беларускай адміністрацыяй.

**МБ**

## СЦІСЛА

### Напарымся

У чацвер і пятніцу зноў будзе да +30—+34°С. 23 ліпеня пройдуць месцамі кароткачасовыя дажджы, навальніцы са шкваламі. 24 ліпеня іх абяцаюць на большай частцы краіны.

### Пенсіі паменшалі

У чэрвені гэтага году рэальны памер пенсіі ў Беларусі (скарэктаваны з улікам індэксу спажывецкіх цэнаў) паменшыўся на 1,2% у параўнанні з чэрвенем 2008. Паводле звестак Белстату, сярэдні памер пенсіі склаў 391 тыс. рублёў, або 116,7% ад сярэднедушавага мінімальнага спажывецкага бюджэту сям'і пенсіянераў.

### Банкі на Віцебшчыне рабаваў уласнік аўтарамонту?

Затрыманыя злачынцы, што здзейснілі напад на мясцовае аддзяленне «Беларусбанку» ў мястэчку Копць Віцебскага раёну, затрыманыя. 7 ліпеня двое невядомых у масках абрабавалі касу на 17 мільёнаў рублёў. Пры гэтым цяжка паранілі касіра. Затрыманыя — не бедныя людзі: адзін з іх кіруе станцыяй тэхабслугоўвання ў Віцебску.

### У Чысці знайшлі мёртвае немаўля

Цела нованароджанага знайшлі ў смеццевым кантэйнеры пасёлку Чысць (Маладзечанскі р-н). Паводле папярэдніх звестак, хлопчык нарадзіўся мёртвым. Цела ў кантэйнеры знайшоў бомж. Міліцыя шукае маці памерлага.

**БелаПАН; Рэгіянальная газета; Вольга Жарнасек**


# Не ўсё ў жыцці ў апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


# Дзякуй за ахвяраванні

Мікалаю В. з Белаазёрску.
Ірыне Ц. з Жыткавічаў.
Аляксандру Д. з Карэліцкага раёну.
Антону Б. з Верхнядзвінску.
С.К. з Пінску.
Віктару К. з Рэчыцы.
Яўгенію К. з Віцебску.
Н.Х. з Шчучына.
Л.А. з Полацкага раёну.
Леакадзіі Н. з Ракава.
Юрасю Ч. з Мазыра.
Валерыю П., Алесю Б. з Баранавіцкага раёну.
Аляксандру Л. з Гомеля.
Сьвятлане К. з Ліды.
Алене Г. з Барысаўскага раёну.
Валянціне Ш., Л.Г., З.А., А.Л., Сямёну Л., Вользе Ш., Ніне Ш., Ігару Б., Дз. Я., В.Б., П.Ч., Р.П., Д.К., В.Л., Алегу М., Г.С., Аляксандру С., Івану С., А.Дз., Валянціне Дз., В.Л., Генадзю Ш., Георгію П., С.Ц., І.Б., І.С., Таццяне В., Алегу Т., Тамары Л., Галіне Ж. з Мінску.

# Што дазволена Юпітэру, не дазволена Дзямку

Працяг са старонкі 1.

Па неафіцыйнай інфармацыі, Аляксей Дзямко падазраецца ў парушэнні артыкулу 424 КК «Злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі». Справа ў тым, што ў перыяд ад 2005 да 2008 году старшыня райвыканкаму нібыта атрымліваў ад ААТ «Савушкаў прадукт» прэміяльныя «за высокія паказчыкі ў развіцці малочнай жывёлагадоўлі». Агульная сума выплат склала 3 мільёны рублёў. Здаецца, не такія і вялікія грошы, тым не менш артыкул цягне на тэрмін да 10 гадоў калоніі.

Схема выплат ад кампаніі адказным асобам — сумнеўная, карупцыягенная практыка. Але вінная практыка, а не Дзямко. І можна падумаць, што пра тую практыку праваахоўныя органы не ведалі раней. Як жа — «Савушкаў прадукт» дарагі сэрцу не толькі чыноўнікаў раённага звяна.

Такое ўражанне, што праваахоўныя органы атрымалі заданне «накапаць на Дзямкоў». Нічога асаблівага не адкапалі, то прычапіліся да першага-лепшага.

Рыгору Дзямко, які з'яўляецца старшынём назіральнай рады СВК «Фядорскі», інкрымінуецца артыкул 426 КК «Перавышэнне ўлады ці службовых паўнамоцтваў». Рыгора абвінавачваюць у тым, што ён неабгрунтавана атрымліваў заробак старшыні калгасу і грашовыя ўзнагароджанні, з'яўляючыся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў. Усяго ён зарабіў на асноўнай пасадзе працы за час дэпутацтва 35 мільёнаў рублёў. Тэрмін яму свеціць такі ж, як і брату.

У аўторак Аляксей Дзямко знаходзіўся на працоўным месцы. Датэлефанавацца да яго ўдалося амаль адразу. Вось што ён паведаміў «НН».

«Я нічога не ведаю пра крымінальную справу. Запытайцеся ў Генеральнай пракуратуры ці недзе яшчэ. Мне пра гэта нават ніхто не паведамляе. Працую во па-ранейшаму. Сваякі таксама працуюць. Зрэшты, якія ў мяне сваякі? Родны брат і сын, ён часова падмяняе адну дзяўчыну, якая ў дэкрэтны сышла. Астатнія ў Расіі. Брата ж я нікуды я не ўладкоўваў, ён кіраўнік адной з найбуйнейшых сельскіх гаспадарак у краіне. Сам старшынём 32 гады працуе. Нікога я не ўладкоўваў».

Цікаўлюся, ці няма насцярожанасці, што ў любы дзень ён можа быць арыштаваны і апынуцца за кратамі. «Я сумленны чалавек. Чаго мне баяцца, калі я некаму не падабаюся», — кажа Аляксей Дзямко.



Аляксей Дзямко — тыповы «крэпкі гаспадарнік».



Рыгор Дзямко кіруе калгасам ужо 32 гады.




Уладзімір Макей лічыць недапушчальным фармаванне рэгіянальных чынавенскіх кланаў.



Століншчына — асаблівы рэгіён. Тут людзі спаборнічаюць нават у памеры катэджаў. На фота: пуск газу ў дамы вяскоўцаў у Альшанах.

Аляксандр Паляруш са Століна мае меркаванне, падобнае да макееўскага. «Яны ўсе ў начальніках ходзяць. Сямейны клан. Сам Дзямко ў райвыканкаме сядзіць, брат ягоны — старшыня калгасу, сын там жа. Ім падабаецца жыць прыгожа, заможна, шыкоўна. Раздольны лад жыцця вядуць, але людзі яны не злаўрэдныя. Нельга сказаць, што яны на некага ціснуць, жыць не даюць. Такога няма», — кажа Аляксандр Паляруш.

Іншы жыхар Століна, які папрасіў захаваць ананімнасць, ацэньвае старшыню райвыканкаму даволі высока: «Нічога кепскага сказаць не магу. З Аляксеем Дзямко часта даводзіцца сутыкацца па працы. Гэта далёка не самы горшы кіраўнік Століншчыны за апошнія гады. А брат ягоны — увогуле малайчына, такую гаспадарку трымае».

Аляксей Дзямко кажа, што ніякіх следчых дзеянняў у дачыненні яго і брата пакуль не праводзіцца. Тым не менш, ён не абвяргае чутак пра крымінальную справу. Напэўна, працяг яе ўсё ж будзе.

Століншчына — асаблівы рэгіён. Аддалены ад вялікіх цэнтраў, ён жыве сваім жыццём. Людзі тут дружныя, роднасныя сувязі сапраўды памятаюць да пятага калена. Раён унікальны тым, што тут працягваецца рост насельніцтва, значная частка якога належыць да пратэстанцкае канфесіі, квітнее прыватная ініцыятыва — да такой ступені, што ў раёне бракуе ворнай зямлі.

Зрэшты, чаго наракаць на Століншчыну, калі вышэйшыя начальнікі ў сталіцы падаюць не найлепшы прыклад самі. Сыны Аляксандра Лукашэнкі пры пасадах: Віктар з'яўляецца дарадцам у Радзе бяспекі, Дзмітрый узначальвае Прэзідэнцкі спартыўны клуб. Сын Уладзіміра Макея Віталь таксама не дворнікам працуе, а ў свае маладыя гады з'яўляецца першым сакратаром пасольства Беларусі ў Аўстрыі. Вось і думаецца пасля гэтага, ці ў Дзямках праблема, ці яны проста трапілі пад раздачу, калі для чарговае «антыкарупцыйнае» кампаніі спатрэбіліся лёгкія ахвяры.

**Зміцер Панкавец**

## Вока за вока

**Пра забарону ўвозу беларускага мяса ў Расію і прыпыненне эксплуатацыі беларускага ўчастку нафтаправоду «Унеча—Вэнтспілс» стала вядома адначасова.**

Эксплуатацыя беларускага ўчастку нафтапрадуктаправоду «Унеча—Вэнтспілс», што належыць прадпрыемству «Захадтранснафтапрадукт», прыпыненая з 17 ліпеня. Падставай стаў аварыйны стан аб'екту.

Звяртае ўвагу тое, што крок супаў з весткай пра забарону паставак мяса ў Расію з Гомеля й Брэсту. Апошнім часам спіс узаемных прэтэнзій уладаў Беларусі і Расіі няўхільна расце.

**МБ**

### Лукашэнка: Мы ніколі не адыдзем ад Расіі

Аляксандр Лукашэнка заклікае не верыць чуткам і інсінуацыям, што распускаюцца ў некаторых СМІ, — пра адыход Беларусі ад Расіі. Пра гэта ён паведаміў сёння на сустрэчы са старшынём Падліковай палаты Расіі Сяргеем Сцяпашыным.

## Мілінкевіч рэабілітуецца пасля аперацыі

Лідэру «Руху «За Свабоду» зрабілі ў Польшчы аперацыю алапластыкі на тазасцёгнавым суставе левай нагі. Аднаўляцца пасля аперацыі ён з'ехаў у родную вёску Бершты.

## Павалілі і білі па галаве

Штомесячная акцыя салідарнасці з палітвязнямі 16 ліпеня скончылася затрыманнямі. На Кастрычніцкай плошчы былі затрыманыя 30 чалавек.

Артур Фінькевіч заступіўся за Андрэя Кіма, якому пагражалі. За гэта ў Цэнтральным РУУСе збілі ўжо самога Фінькевіча.

Па словах лідэра «Маладых дэмакратаў» Міхаіла Пашкевіча, два амонаўцы павалілі Артура і пачалі наносіць нагамі ўдары па галаве і жываце. Фінькевіч кажа, што не збіраецца падаваць скаргу ў суд, бо выйграць яго немагчыма. А прыклад з Сяргеем Парсюкевічам сведчыць, што можна атрымаць сустрэчны пазоў.

Пратаколы на затрыманых не складалі. І выпусцілі праз тры гадзіны.

**ЗП**

## СЦІСЛА

### Аўтуховіч спыніў трохмесячную галадоўку

Ваўкавыскі прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч галадаў ад 16 красавіка. Вязень так і не дамогся змянення меры стрымання ці перадачы справы ў суд. Следства працягнутае да 8 жніўня.

### Пазняк: «На выбары з Лукашэнкам пойдуць правакатары ці неглыбакадумныя»

Падчас абмеркавання планаў дзейнасці на ліпеньскім сойме КХП-БНФ прынятае рашэнне, што ўдзел у выбарах разам з «узурпатарам Лукашэнкам недапушчальны», паведаміла інфармкамісія партыі. Толькі выбары без удзелу Лукашэнкі маюць сэнс, мяркуюць народнікі-кансерватары.

### Ісландыя падала заяўку ў ЕС

Парламент Ісландыі прагаласаваў за падачу заяўкі на ўступленне краіны ў Еўрапейскі Саюз. Дэбаты працягваліся на працягу пяці дзён. Супраць выступаюць перадусім рыбакі краіны. Прагаласаваў супраць і міністр сельскай гаспадаркі і рыбалоўства Ісландыі.

**ЗП**

# Лато ці лахо?




Беларускія латарэі. Сучасны твар беларускай фартуны.

**Латарэйная кампанія «Спорт-пары» хутка даганяе «Суперлато». Акцыянерам першай з'яўляецца Прэзідэнцкі спартовы клуб Дзмітрыя Лукашэнкі. Другой кіруе былы муж Наталлі Пяткевіч.**

Усё нашае жыццё — гульня, а ў гэтай вялікай гульні ёсць яшчэ і штотыднёвыя розыгрышы. Розыгрышы кватэр, машын і немалых грашовых сумаў. Латарэі трывала ўвайшлі ў жыццё беларусаў і сталі яго нязменным атрыбутам.

«Ваша лато» і «Суперлато» пакуль што з'яўляюцца асноўнымі функцыянерамі беларускага латарэйнага бізнэсу. Наўздагон ім ідзе маладая кампанія «Спорт-пары», якая пераняла вядомы савецкі брэнд «Спортлато», спалучыўшы яго з сучаснымі амерыканскімі гульнёвымі тэрміналамі.

«Ваша лато» — піянер-першапраходзец беларускіх латарэяў. Яго арганізатар, РУП «Беларускія латарэі», было створанае ў адпаведнасці з Дэкрэтам прэзідэнта ад 12 мая 1998 г. № 6 «Аб некаторых мерах па ўпарадкаванні латарэйнай дзейнасці». На афіцыйным сайце «Вашага лато» паведамляецца, што «грашовыя сродкі, атрыманыя ад правядзення латарэяў (гэта значыць, 50% ад агульнага выйгрышнага фонду кожнага тыражу. — Заўв. аўт.) мэтава накіроўваюцца на развіццё фізкультуры і спорту, ахову здароўя, адукацыю, ..., ахову гістарычна-культурных каштоўнасцяў, а таксама на іншыя мэты, вызначаныя кіраўніком дзяржавы».

Такім чынам, купляючы білецік «Ваша лато», кожны беларус, марачы аб джэкпоце, насамрэч займаецца дабрачыннасцю. Толькі не сам. Грошы... размяркоўвае Аляксандр Лукашэнка. Эфект шчодра выкарыстоўваецца ў прапагандысцкіх мэтах.

Праз чатыры гады ў беларускае латарэйнае зацішша ўварваўся сапраўдны ўраган — «Суперлато». Успамінае спадарыня К., якая працуе распаўсюдніцай білетаў з самага заснавання кампаніі: «Менавіта «Суперлато» прыдумала разыгрываць машыны. Першыя «мэрсэдэсы» ішлі на «ўра», а калі дадаўся розыгрыш кватэраў, людзі стаялі ў чэргах, каб купіць білет. За два гады «Суперлато» адпрацавала ўсе інвестыцыі і стала па-сапраўднаму зарабляць».

РУП па арганізацыі латарэяў «Нацыянальныя спартыўныя латарэі» было створанае на аснове загаду Міністэрства спорту і турызму РБ №1215 ад 25 жніўня 1999 году, ліцэнзію на правядзенне латарэйнай дзейнасці «Суперлато» атрымала ў 2004 годзе. Узначальвае «Нацыянальныя спартыўныя латарэі» Уладзіслаў Пяткевіч. Мінспорту і застаецца адзіным акцыянерам прадпрыемства.

Стасункі паміж латарэйнымі калосамі «Суперлато» і «Ваша лато» не заўсёды былі нейтральна-сяброўскімі. «Ваша лато» хутка пачало капіяваць усе новаўводзіны «Суперлато» — розыгрышы шыкоўных машын, кватэр, яркія постэры, такое, ну... скажам, сэксуальнае шоў... «Суперлато» хацела ў суд падаваць, але яму не дазволілі. Сказалі, што чым больш латарэяў, тым больш грошай ідзе ў дзяржаўны бюджэт», — апавядае спадарыня Н., рэалізатар «Суперлато» са стажам.

На сёння «Суперлато» па продажах і папулярнасці стабільна апераджае «Ваша лато». Для параўнання: за тыраж 06.06.09—07.06.09 было рэалізавана 383 808 білетаў «Суперлато» і толькі 192 223 білетаў «Вашага лато». Узімку, у пік латарэйнага сезону, «Суперлато» рэалізуе каля пяцісот тысяч білетаў, «Ваша лато» — каля трохсот. «Зімой я прадаю 150 білетаў, летам — 80—90», — кажа спадарыня К.

«Суперлато» апярэдзіла «Ваша лато» і ў тэхнічным плане: у «Суперлато» цяпер можна гуляць анлайн з дапамогай плацежных сістэм Easy Pay і Web Money, чытаць правілы гульні аж на шасці замежных мовах: расійскай, ангельскай, кітайскай, гішпанскай, украінскай, польскай. Акрамя беларускай... Кампанія матывавала адсутнасць беларускамоўнай версіі сайту недахопам сродкаў для аплаты перакладчыкаў і праграмістаў... Бедненькія.

Заробкі ў рэалізатараў білетаў цалкам залежаць ад продажаў, бо яны не з'яўляюцца штатнымі супрацоўнікамі. У «Суперлато» за месяц атрымліваюць больш за мільён рублёў зімой і каля васьмісот тысяч летам, у «Вашым лато» — крышку менш. Часам справу псуе тое, што рэалізатары могуць пралічыцца з колькасцю пакінутых білетаў на выходныя: «Ваша лато» праводзіць розыгрышы ў суботы, «Суперлато» — ў нядзелі. За дзень да розыгрышу да распаўсюджвальнікаў прыязджае «інкасацыя», каб забраць нерэалізаваныя білеты і спісаць іх з тыражу. Распаўсюджвальнік сам прагназуе колькасць білетаў, якія б змог прадаць у апошні дзень розыгрышу. Непраданыя білеты, натуральна, пакідае сабе і спадзяецца на фартуну. «У мінулую нядзелю ўляцела аж на трыццаць непрададзеных білетаў, — кажа спадарыня А. з «Вашага лато», — з іх па мізэры выйграла толькі сем... Сплыў мой заробак за паўтыдня». Што датычыць штатных супрацоўнікаў латарэяў, то з заробкамі ў іх усё сапраўды «супер». Супрацоўніца Дзяржкантролю паведаміла ў прыватнай размове, што ў штаце адной з латарэяў заробкі за 2008 год дасягнулі чатырох мільёнаў рублёў.

Пяройдзем цяпер да маладога канкурэнта са старой назвай «Спортлато». Першы тыраж «Спортлато 5 з 36» прайшоў у кастрычніку 2008. Адчуваецца, што высокатэхналагічная латарэя пакуль не надта прыжылася на беларускай глебе, хаця з'яўляецца вельмі папулярнай у ЗША і краінах Еўрасаюзу. Сутнасць гульні заключаецца ў тым, што чалавек сам загадвае 5 нумароў з 36, закрэслівае іх на спецыяльным бланку і аддае аператару тэрміналу. Аператар рэгіструе стаўку і выдае пакупніку чэк-прагноз, па якім ён зможа праверыць білет і атрымаць выйгрыш. Ніякіх кватэр і машын, толькі грошы. Джэк-пот расце па меры таго, як робяцца стаўкі. «Людзі пакуль што баяцца гуляць, — расказвае спадар В., аператар тэрміналу. — Для іх гэты тэрмінал выглядае як нешта незразумелае. Іншая справа — звыклыя нумары троек, кватэры, машыны. Хаця «Спортлато» мае адныя плюсы — чалавек больш удзельнічае ў працэсе гульні. Але пакуль што ў нас за дзень ад чатырох да дзесяці ставак, у той час як вакол «Суперлато» заўсёды мітусіцца народ. Адны малыя нашыя бланкі цёгаюць». Што ж, дзеці заўсёды найхутчэй успрымаюць усё новае.

У самой кампаніі «Спорт-пары» на продажы глядзяць больш аптымістычна: «Мы — маладая кампанія. У нас пастаянна растуць продажы, асабліва падчас рэкламных акцый (маецца на ўвазе акцыя «Джэк-пот + 300 мільёнаў». — Заўв. аўт). «Суперлато» і «Ваша лато» аджываюць свой век, у іх ужо ўпалі продажы. Будучыня — за намі». Дарэчы, акцыянерамі ЗАТ «Спорт-пары» з'яўляюцца РДГА «Прэзідэнцкі спартыўны клуб (старшыня цэнтральнае рады — Дзмітрый Лукашэнка), ПУП «СЕН-КО» і сумеснае беларуска-ангельскае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Дзелавая сетка». Мэтаю правядзення электроннай інтэрактыўнай гульні «Спортлато» з'яўляецца «атрыманне сродкаў для фінансавання спартыўных і сацыяльна-культурных праграм, рэалізоўваных у рамках дзейнасці РДГА «Прэзідэнцкі спартыўны клуб». Апаратуру для «Спортлато» распрацавала амерыканская карпарацыя GTECH.

Аўтару, лато-скептыку, было цікава назіраць за пакупнікамі латарэек. Беларусы ўсіх узростаў насамрэч любяць гуляць у лато, асабліва пенсіянеры. Непаўналетнія хлапчукі сціпла просяць праверыць білецік «Суперлато»; дзядок актыўна закрэслівае крыжыкі на бланку «Спортлато»; кабета нервова пытае «Дзе «Пя-я-я-цё-ё-ё-ра-а-а-ачку» праверыць?»; сямейная пара доўга цягне «тройку»... Падобныя сюжэты назіраюцца кожны дзень ва ўсіх пунктах продажу. І паўсюль чуецца: «Дзе мая кватэра?», «Дзе мой джэк-пот?», «Калі ж я ужо штосьці выйграю?», «Ну чаму зноў нічога?», часам нават: «Спыніце гэты лахатрон!», «Падманваюць яны нас»...

Спадарыня К. на пытанне, ці верыць яна ў рэальнасць выйгрышаў, адказала наступным чынам: «Я б не купляла ўвогуле гэтых білетаў, калі б дакладна не ведала, што адна мая сталая кліентка выйграла машыну. Дзяўчаты з нашага раёну тры месяцы назад выйгралі, здаецца, трыццаць пяць мільёнаў рублёў». Спадарыня Н. злосна абвяргае аптымізм спадарыні К.: «Паглядзіце самі, мне давялося ўзяць сабе 35 білетаў, з іх толькі 7 штосьці выйгралі»...

Лато ці лахо, але беларусы будуць у яго гуляць. Тое самае адбываецца ў іншых бедных краінах, дзе людзі не могуць самі зарабіць на кватэру, на адпачынак і іншыя радасці жыцця, якія можа падараваць джэк-пот. На думку аўтара, часам можна спакусіцца на латарэйны білецік, толькі без фанатызму. Псіхолагі ведаюць шмат прыкладаў, калі пастаянныя пройгрышы ў латарэю даводзяць людзей да дэпрэсіі. Але калі вам надта хочацца ўнесці сваю лепту ў развіццё фізкультуры, спорту і прапаганды ў нашай краіне, то купляйце адразу некалькі «троек»!

**Вікторыя Грынеўская**

# У піку Крамлю Лукашэнка асядлаў «Харлей-Дэвідсан»

Піша **Аляксандр Класкоўскі**.

Скачкі на прыз прэзідэнта Расіі сабралі 18 ліпеня, мякка кажучы, сціплую кампанію ганаровых гасцей. І хоць гэтым разам збору не надаваўся статус саміту СНД без гальштукаў, кожны з запрошаных Мядзведзевым па-свойму адказаў на фірмовае расійскае пытанне «Ты мяне паважаеш?». Лукашэнка скачкі праігнараваў.

Выйграў спаборніцтва расійскі жарабок Манамах. Увогуле ж гэтае мерапрыемства адлюстравала правал расійскай палітыкі на абсягу СНД, мяркуюць назіральнікі.

Паказальна, хто прыехаў, а хто не прыехаў на скачкі. Інакш кажучы, хто закусіў цуглі.

На запрашэнне Мядзведзева адгукнуліся прэзідэнты Арменіі, Азербайджану, Казахстану, Малдовы, Таджыкістану. Першыя двое абмеркавалі пры пасярэдніцтве расійскага калегі карабахскую праблему. Назарбаеў не прамінуў зноў паказаць сябе найлепшым інтэгратарам (хаця насамрэч і ў яго з Масквой не ўсё гладка). Кішынёў і Душанбэ цалкам залежаць ад крамлёўскай эканамічнай ласкі.

У той жа час Ючшанка, які толькі што абвесціў намер зноў балатавацца ў прэзідэнты, дэманстратыўна выбраўся ў Карпаты.

Паміж Туркменістанам і Крамлём — сур'ёзныя супярэчнасці на газавай глебе. Пакрыўджаны Ашхабад, здаецца, даспявае да ўваходжання ў праект «Набука», які дазволіць пампаваць газ у Еўропу ў абыход Расіі.

Знайшоў адгаворку кіргізскі кіраўнік. Бішкек нядаўна прадынаміў Маскву, зноў даўшы базу амерыканскім летунам.

Далей: узбекскі аўтакрат Карымаў даўно адышоў ад шоку андыжанскай бойні, калі давялося прытуліцца да Крамля, і зноў вядзе сваю гульню, у прыватнасці, з тымі самымі Штатамі. Паказальна, што Узбекістан, як і Мінск, не падпісаў пагаднення аб КСАР АДКБ (пры тым, што менавіта Карымаў лабіяваў гэтую ідэю пасля падзей у Андыжане ў 2005 годзе).

А вось малдаўскі прэзідэнт Варонін, наадварот, лавіў на скачках свой шанец перад вырашальнымі для яго паўторнымі парламенцкімі выбарамі, прызначанымі на 29 ліпеня. Лідэр камуністаў прагне давесці, што здольны прабіць у Маскве фінансава-эканамічную падтрымку.

З ласкі Пуціна Малдове засвяціў крэдыт на паўмільярда даляраў (акурат столькі «недадалі» Беларусі з абяцаных двух мільярдаў, што Лукашэнка ў інтэрв'ю Die Presse паабяцаў надоўга запомніць). Сімптомам пацяплення ў стасунках між Кішынёвам і Масквой стала і тое, што раптам падабрэў галоўны санітарны доктар Анішчанка, які раней ваяваў супраць малдаўскага віна. Цяпер яго дазволена гнаць у Расію цыстэрнамі.

Беларусаў жа той самы Анішчанка працягвае страшыць другой малочнай вайной. У пятніцу Лукашэнка адмыслова папярэдзіў сваіх чыноўнікаў, каб да 1 жніўня ўтрэслі ўсе пытанні з тэхрэгламентам на тыя сыры-тварагі. Амбасадар Сурыкаў насуперак заявам Лукашэнкі працягвае цвердзіць, што беларусы самі прапанавалі спіс малаказаводаў на продаж.

Зрэшты, малочная вайна — толькі адна з праяваў сістэмнага крызісу двухбаковых дачыненняў. І пачаўся ён не ўчора. Сімвалічная фраза Пуціна пра мух і катлеты прагучала ў 2002 годзе. Тады ж Лукашэнка заявіў: Беларусь ніколі не стане 90-м суб'ектам РФ.

Дарэчы, летапіс скачак на прыз




прэзідэнта Расіі яскрава ілюструе, наколькі пакручастымі былі дачыненні Крамля з беларускім партнёрам усе гэтыя гады.

Калізія ўзнікла ўжо ў звязку з першымі такімі скачкамі ў 2004 годзе (заўважце: неўзабаве пасля першай жа газавай вайны). Пуцін запрасіў беларускага калегу на 3 ліпеня, выдатна ведаючы, што ў той самы дзень у Мінску парад.

Натуральна, Лукашэнка выбраў ролю першай асобы на афіцыйным Дні незалежнасці, а не ролю статыста на чужым іпадроме.

У 2005 годзе скачкі, да якіх прывязалі нефармальны саміт СНД, ладзіліся ў Казані. Вось там Лукашэнка і наведаў іпадром. Паказальна, што двухбаковая сустрэча тады ў яго была не з Пуціным, а з Ючшанкам.

У 2006 годзе скачкі-саміт зноў адбыліся ў Маскве. Тут ужо Лукашэнка ўжыў прынцып «мухі асобна, катлеты асобна». То бок пабыў на саміце, а на конскія спаборніцтвы не застаўся. Маўляў, сябра Чавэс прылятае ў Мінск — няма калі тут бавіцца.

Цікава, што цераз год на скачках у Растове-на-Доне прысутнічаў усюдыісны Чавэс — а вось ягоны мінскі аміга не прыляцеў.

Нарэшце, летась скачкі аказаліся скамечанымі праз вайну на Каўказе. Мерапрыемства прайшло ў Пяцігорску ўвогуле без прэзідэнтаў, выключна дзеля птушачкі.

Такім чынам, за ўсю гісторыю гэтых скачак Лукашэнка прысутнічаў на іх толькі аднойчы, ды і тое не ў Маскве, а ў татарскай сталіцы. Але калі раней адгаворкі прымаліся расійцамі стрымана, то цяпер тэза «не любіць коней» выклікае сарказм.

Дачыненні між Лукашэнкам і расійскім кіраўніцтвам як ніколі кепскія. Толькі што адгрымела малочная вайна (і Анішчанка намякае на працяг). У чэрвені Лукашэнка байкатаваў саміт АДКБ, і яго рашэнні дасюль вісяць у паветры.

Нарэшце, на скачкі гэтым разам нароўні з лідэрамі краін СНД былі запрошаны Багапш з Какойты. А вы ж ведаеце, што для беларускага начальства пытанне аб прызнанні дзвюх маленькіх, але гордых каўказскіх рэспублік — як горкая рэдзька. Хапіла ўжо таго, што ў Сочы Лукашэнку ладзілі вочную стаўку з тымі каўказскімі лідэрамі. Пэўна ж, і ў Маскве састыкавалі б. Карацей, ведаем мы вашыя скачкі: кось-кось — ды ў аглоблі!

Ужо адна толькі тэлекарцінка такой «стыкоўкі» — мінус у вачах Еўропы. І потым, гэта выглядала б як дрэсіроўка беларускага кіраўніка з прыцэлам на будучыя саміты саюзнай дзяржавы, у якую марацьуступіць Абхазія з Паўднёвай Асеціяй.

Калі ж глядзець глабальна — ні ў Мінску, ні ў Масквы няма рэальнай, дзейснай стратэгіі двухбаковых дачыненняў. У беларускага начальства стратэгія заўжды была адна — брацьна дурніцу. Сёння з Крамля кажуць: абламайцеся! Там перакаваліся, кажучы іпадромнай мовай, што не ў каня корм. Але і Крэмль, у сваю чаргу, не ўяўляе, што рабіць з гэтай Беларуссю. Таму то наяздзае ў духу браткоў, то зноў дастае пернік.

І яшчэ штрых. На нядаўніх перамовах у Маскве «гаспадары пляцоўкі» спрабавалі выціснуць з Абамы прызнанне «асаблівых інтарэсаў» Расіі ў так званым блізкім замежжы. Наколькі можна меркаваць, Абама постсавецкую прастору не «здаў». І гэта таксама плюс для Беларусі.

Што ж да інтрыгі вакол скачак, то Лукашэнку падказалі арыгінальны піяр-ход. У выніку ён мала што праігнараваў запрашэнне Мядзведзева, дык яшчэ і сустрэўся 18 ліпеня з байкерамі, што выбраліся ў Мінск на фестываль з розных краін Еўропы і нават ЗША.

Гэта вам не «Дажынкі» і не прапахлы нафталінам «Славянскі базар»! Крутыя маладзёны падарылі афіцыйнаму кіраўніку куртку з байкерскай сімволікай і прапанавалі ўзначаліць іх парад. Што ён і зрабіў, прамчаўшы са сваім Колем на легендарным «Харлеі-Дэвідсане».

Раней Лукашэнка не заўважаўся ў падгульванні субкультурам заходняга паходжання. Але тут, мусіць, важна было давесці крамлёўцам: вашыя сярэднявечныя ўцехі мяне не грэюць — я аддаю перавагу сапраўднаму драйву на жалезным кані!

# Найвышэйшая госця з турмы народаў

**Усё змяшалася ў доме беларусаў — усе тут сталі сваімі. І княгіня Раманава, і графіня Радзівіл, і Містэр Не камуністычнай імперыі, і Бора Маісееў. Піша Сямён Печанко.**

Сёлетні ліпень выдаўся шчодрым на візіты. Так, напрыклад, 16—18 ліпеня Беларусь наведала кіраўніца Расійскага імператарскага дому княгіня Марыя Раманава. З гэтай нагоды афіцыйныя і не толькі СМІ захлынаюцца ад захаплення: «Вялікую княгіню М.Раманаву ў Гомелі сустракаюць чыноўнікі, праваслаўнае духавенства і дзяўчаты ў нацыянальных строях», «Вялікая княгіня Марыя Раманава размаўляла на сустрэчы з гомельскімі дэпутатамі і чыноўнікамі пра развіццё Гомельскай вобласці і яе гісторыю», «На сняданак княгіні Раманавай у Гомелі ў гатэльны нумар падалі



блінчыкі, масла, сыр, кашу, дранікі, ёгурт і сок». Візіту княгіні Раманавай надаецца нашмат большая ўвага, чым травеньскаму прыезду Альжбэты Радзівіл.

Толькі якое дачыненне мае тая Раманава да Беларусі? Ці мы назад у «турму народаў» (ленінскае вызначэнне царскай Расіі) захацелі? З якой такой радасці гомельскія дэпутаты і чыноўнікі мусяць абмяркоўваць з гэтай асобай развіццё Гомельскай вобласці і яе гісторыю?

Улічваючы сапраўдны ўплыў роду Раманавых на лёс не толькі Гомельскай вобласці, але і ўсёй краіны, дзіўным падаецца тое, з якой помпай сустракаюць у Беларусі княгіню, чый светапогляд відавочна не змяніўся. Чаго толькі вартая яе заява пра тое, што гэты прыезд у Беларусь — «першы афіцыйны візіт у тую частку былой Расійскай імперыі, якая ІСНУЕ САМАСТОЙНА».

Заўважым, што незалежнае грамадства ў асобе намесніка старшыні Партыі БНФ Вінцука Вячоркі негатыўна адрэагавала на прыезд Раманавай. «Раманавы — заваёўнікі нашай Бацькаўшчыны. Крывавыя. На руках Раманавых кроў вяароў Касцюшкі, Кастуся Каліноўскага, паламаныя лёсы Багрыма й Багушэвіча ды мільёнаў, мільёнаў беларускіх сялянаў і шляхты, святароў, мяшчанаў, князёў», — адзначыў В.Вячорка.

Яшчэ адной знакавай падзеяй ліпеня можа стаць адзначэнне 100 гадоў з нараджэння былога міністра замежных справаў СССР Андрэя Грамыкі, ураджэнца Беларусі.

Ізноў жа, што таму Грамыку, вернаму служаку імперыі, было да Беларусі?

І, канечне, не абмінуць сёлетняга Славянскага базару ў Віцебску. Безумоўна, фестываль мае шмат плюсаў. Але ў чалавека, які не мае магчымасці асабіста ў гэтым упэўніцца, можа скласціся адваротнае ўражанне. Бо на паверхню ўсплывае толькі тое, што... Што ўсплывае, карацей. Што мае адпаведны ўзровень скандальнасці, здольнае падтрымліваць увагу масавага гледача і чытача на працягу шматдзённага фестывальнага марафону.

Якую тупасць, якую пустэчу тыражуюць сур'ёзныя і несур'ёзныя, лукашэнкаўскія і апазіцыйныя СМІ!

Хто з расійскіх «зорак» прыехаў на найдаражэйшым аўто, што яны елі на сняданак. Маісееў: «Так, я — расп...яй!» — фотарэпартаж на БЕЛТА. І яму за гэта яшчэ і заплацяць, а, як вядома, «хуліганствы» прывазных «зорак» складаюць адну з самых значных крыніцаў выдаткаў фестывалю. І вось парадокс: каб зладзіць чарговы З'езд беларусаў свету, яго арганізатары мусяць хіба толькі не разбіцца ў блін — нават залю арандаваць з боем, радуючыся, што дзяржава хоць бы моцна не замінае. А тая самая дзяржава ў гэты час валаваннямі з ікрой сустракае княгіню Раманаву ды падпісвае чэкі на гіганцкія ганарары пасівелым расійскім «фанаграмшчыкам».

# Міс Грудзі і містэр Пеніс

Чаму і дзеля каго адбываюцца конкурсы прыгажосці? Піша **Жанна Ямайкіна**.

У Беларусі прайшоў конкурс «Міс грудзі Беларусі-2009». Як аптымістычна паведаміў Інтэрфакс «упершыню». Я задалася пытаннем, каму, навошта і ці ўвогуле патрэбныя такія конкурсы, і паспрабавала сабраць думкі беларускіх блогераў на гэтую тэму.Меркаванні падзяліліся ўмоўна кажучы на «Грудзі — гэта добра, хай будзе!» і «Які жах, жанчын ізноў як рэч выстаўляюць на паказ!». Негатыўна выказваліся ў асноўным жанчыны. А вось мужчыны, за рэдкім выключэннем, прынялі тую з'яву пазітыўна.

Адстойваючы права конкурсу «бюстаў» на існаванне, прыхільнікі падкрэслівалі, што дзяўчаты ідуць туды добраахвотна, ніхто іх за косы не цягне. Нібыта магчымасць паказаць сябе без вопраткі падыме ім самаацэнку. Ну і паездка ў Парыж, само сабой, як фінансавае заахвочванне для пераможцы.

У конкурсе бралі ўдзел дзесяткі жанчын. З іх перамагла адна, яшчэ дзве атрымалі суцяшальныя прызы. Так што калі і падняласа ў некага самаацэнка праз перамогу, то большасць якраз аказаліся «у пралёце».

Дый чаму менавіта ацэнка чужымі людзьмі тваіх грудзей павінна уплываць на тое, як ты сама да сябе ставішся? Не прафесіяналізм, не чалавечыя якасці, не талент і інтэлект, ці хаця б густ, а менавіта твая частка цела? Нешта, што не мае ніякіх адносінаў да таго, што завецца асобай.



Мужчыны, некарысталюбнымі спадарожніцамі жыцця могуць быць толькі роўныя вам.

Можа і сапраўды гэта нармальна ацэньваць сябе па выглядзе і пагаджацца, каб цябе асацыявалі выключна з тваімі сцёгнамі ці бюстам? Але чаму ж тады гэтае «нармальна» існуе толькі для кабет? Кожны з апытаных мужчын лічыць такі спосаб паказытаць сваё «эга» для сябе непрымальным. Большасць скептычна і нават са смехам паставілася да ідэі такіх жа конкурсаў на часткі цела мужчыны, напрыклад, торса ці члена. Але ў чым прынцыповая розніца, хіба ж мужчына і яго цела не бывае прыгожым? Чаму тыя, хто казаў «Грудзі — гэта здорава, хай будзе!» не хочуць чуць «Які зад у гэтага прыгажуна!»?

Ну і галоўнае пытанне пра дзяўчат — ці сапраўды яны пайшлі б на той конкурс, калі б мелі роўныя магчымасці з мужчынамі? У сітуацыі ж, калі працадаўцы больш ахвотна бяруць на працу мужчын і пры аднолькавым вопыце і адзнаках у дыпломе добрае месца хутчэй дастаецца кандыдату мужчынскага полу, ясна, што ў жанчыны меншы выбар у сэнсе рэалізацыі сябе. Менш забяспечанасці і ўпэўненасці ў будучыні.

Менавіта таму інтуітыўна беларуская жанчына адчувае, хочаш выжыць — трэба пашыраць магчымасці, разглядаць варыянты, якія адкідваюцца больш упэўненым у будучыні чалавекам. Не кожная гатовая сапраўды прыкласці падвойныя намаганні, каб прабіцца ў свеце мужчын. Шмат хто думае, што лепш — ісці «лёгкім шляхам» і шукаць мужчыну-падпорку. Не самой рэалізоўвацца, а на яго спадзявацца. Адсюль і жаноцкая канкурэнцыя і спробы як мага большай колькасці мужчын падабацца. Таму і на абцасах ногі калечым і ў непрактычнай, але сэксоўнай вопратцы ходзім, і час на манікюр ды салоны прыгажосці марнуем. А калі за прафесійныя поспехі даюць дыпломы, медалі і прэміі, то і за такую працу «над сабой» жанчына хоча адзнаку, лепш за ўсё паставіць штамп «вышэйшы гатунак». Вось і выходзяць кабеты на падмосткі з аголенымі попамі. Усё з надзеяй той штампік атрымаць і стаць больш прывабным «таварам» на рынку, дзе ідуць баі «за мужыка».

А ці прыемна самім мужчынам потым у ролі такой падпоркі?

Мабыць, усё-такі не, раз так часта можна пачуць, як мужчыны не любяць тых, хто іх «за грошы любіць» ды як цяжка знайсці добрую, мілую і некарысталюбную сяброўку. Але ж, даражэнькія, некарысталюбныя могуць быць тыя, хто з Вамі на роўных. Толькі роўня будзе любіць шчыра. Падпорку любіць бескарыслівa немагчыма, на тое яна і падпорка. Яе страшна згубіць і яе трэба прывязваць. Мае сэнс падумаць над гэтым перад наступным конкурсам «мокрых цішотак».

Ну а наша прыгожая пераможца пакуе турыстычныя валізкі. І думае, мабыць, нешта накшталт таго, што «пяць хвілін ганьбы, затое Эйфелеву вежу пабачу». А мо пра ганьбу і не думае, мо ганарыцца, хаця з бацькам, строгім мусульманінам, наўрад ці яна засталася ў добрых адносінах. Затое Парыж і штамп якасці на тушцы... прабачце, дыплом пераможцы важнага рэспубліканскага конкурсу.

Ізноў жа, паездка у Парыж. Не кожная бедная жанчына пойдзе агаляцца за турпаездку. Але багатая дакладна ніводная. І мужчына нават сярэдняга заробку не пойдзе. Бо ў яго больш магчымасцяў на тую паездку грошы знайсці, не рызыкуючы хадзіць па жыцці з кляймом «Містэр пеніс Беларусі 2009».

**Пра конкурс «Міс грудзі Беларусі» — у №26 «НН».**

# Першыя людзі на Месяцы

20 ліпеня 1969 году амерыканскія астранаўты высадзіліся на спадарожніку Зямлі. Піша **Віталь Тарас**.

## Адбітае святло

«Разважаючы пра Каталіцкую Царкву, мы можам параўнаць яе з поўняй, і не толькі ў сілу сувязі паміж поўняй і жанчынай (як маці), але таксама таму, што поўня, то бок Месяц, не мае ўласнага святла. Ён атрымлівае святло ад Сонца, без якога ўладарыла б поўная цемра. Месяц ззяе, але святло не належыць яму. Месяцавыя зонды і астранаўты ўбачылі, што Месяц ёсць не чым іншым, як камяністай пустэчай, падобнай да пустыні. Яны бачылі скалы і пяскі, карціну, выразна адрозную ад таго вобразу, які склаўся ў нас са старажытных часоў. Месяц — не што іншае як скалы і пяскі, але ён адбівае святло.

Хіба гэта не дакладны вобраз Касцёлу? Кожны, хто вывучае яго і паглыбляецца ў яго, таксама як і на Месяцы, нічога не адкрые, акрамя пустыні, пяскоў і скалаў, — чалавечых слабасцяў, якія нагадваюць пыл, камяні, запусценне. Аднак неаспрэчны той факт, што, нават калі ён ёсць не чым іншым як пяскамі і камянямі, таксама, з ласкі Пана, ён ёсць Святлом».

Ці не праўда — гэты паэтычны фрагмент эсэ Ёзафа Ратцынгера крыху мяняе нашае ўяўленне пра папу Бенедыкта XVI, якога многія лічаць суровым педантам? Гэтае эсэ пад назвай «Чаму я каталік» было напісанае ў 1971 годзе, за сем гадоў да таго як яго аўтар стаў кардыналам.

Звярніце ўвагу — папа ў ім згадвае амерыканскіх астранаўтаў. Ўражанне ад іх палётаў на Месяц у той час было яшчэ зусім свежае. 16 ліпеня 1969 году пачаўся легендарны палёт «Апалона-11». Астранаўты Ніл Армстранг і Эдвін (Баз) Олдрын-малодшы спусціліся на спадарожнік Зямлі ў спецыяльным модулі. Яны першымі ступілі на паверхню Месяца і ўсталявалі там сцяг ЗША. Яшчэ адзін астранаўт — Джэймс Колінз — заставаўся на калямесяцавай арбіце на борце касмічнага карабля.

## «А читательская масса где-то рядом...»

Высадку астранаўтаў на Месяцы мне, як і мільёнам іншых людзей, пашчасціла бачыць па тэлевізары ў той самы дзень. Я быў далёка ад дому — у Кактэбелі, папулярным ужо тады курорце на ўзбярэжжы Крыму. Не сказаць каб «вялікі крок чалавецтва» выклікаў асаблівы ажыятаж сярод тых, хто адпачываў на моры. (Як спяваў Аляксандр Галіч у сваёй песні, «...а читательская масса где-то рядом жарит мясо»). Але некалькі савецкіх пісьменнікаў усё ж захацелі пабачыць унікальную падзею і ледзь не са скандалам дамагліся ад адміністратара, каб той адчыніў фае, дзе стаяў тэлевізар.



## Гэтага не можа быць...

Увядзіце ў пашукавік у інтэрнэце слова «Луна», і перад вамі разгорнецца цэлы веер спасылак на тое, што палёты амерыканцаў на Месяц — містыфікацыя, прапаганда. Высадка астранаўтаў «Апалона-11» нібыта была зянятая ў Галівудзе, каб прадэманстраваць уяўную перамогу ЗША над СССР у касмічнай гонцы. Мабыць, выбух кіслароднага балона на борце «Апалона-13», экіпаж якога, не дасягнуўшы Месяца, з цяжкасцю вярнуўся на Зямлю, таксама быў часткай геніяльнага шматсерыйнага сцэнару?

Былы савецкі касманаўт Канстанцін Феактыстаў узгадваў у адным з інтэрв'ю, што ў СССР уважліва сачылі за тэлерадыётрансляцыямі з Месяца, слухалі ў эфіры перамовы ўдзельнікаў касмічнай экспедыцыі. Калі гэта містыфікацыя, дык трэба было спачатку даставіць на Месяц радыёабсталяванне. Ці не занадта дарагая атрымлівалася інсцэніроўка? Асабліва калі ўлічыць, што ў рамках праграмы «Апалон», старт якой даў у 1961 годзе прэзідэнт Кенэдзі, адбыліся 11 касмічных палётаў. Першым на арбіту вакол Месяца выйшаў экіпаж «Апалона-8» яшчэ ў 1968 годзе. Усяго амерыканскія астранаўты 6 разоў высаджваліся на яго паверхні, апошні раз гэта было ў снежні 1972 году, падчас экспедыцыі «Апалона-17». Экспедыцыі даставілі ў лабараторыі НАСА дзесяткі кілаграмаў грунту з Месяца.

Але прыхільнікаў «тэорыі змовы», якіх хапае і ў ЗША, і ў сучаснай Расіі, усё гэта не хвалюе. Свае высновы яны грунтуюць на тым, што пры канцы 1960-х яшчэ не было такіх тэхналогіяў, якія дазволілі б здзейсніць палёт на Месяц. То бок гэтага не магло быць, таму што быць не магло.

Спрачацца з прыхільнікамі падобных тэорыяў немагчыма, як немагчыма ў чымсьці пераканаць тых, напрыклад, хто верыць, што распад СССР стаў вынікам жыдамасонскай змовы. Галоўнае тут не ў нейкіх аргументах і фактах, а менавіта ў татальным бязвер'і, у негатыўным успрыняцці жыцця ў цэлым, адмаўленні моцы чалавечага духу.

## Селеніты і зямляне

Пазыўным экіпажу «Апалона-11» было слова «Калумбія». Так называўся фантастычны снарад у папулярным рамане Жуля Верна «З гарматы на Месяц».

Героі раману іншага знакамітага фантаста — Герберта Уэлса — «Першыя людзі на Месяцы» дабраліся да мэты з дапамогай «кайварыту» — рэчыва, якое нейтралізавала сілу гравітацыі.

Англійскі пісьменнік пісаў, натуральна, не пра Месяц і не пра яго жыхароў — селенітаў, а пра нас, зямлян. Вось, напрыклад, апісанне селеніцкай «інтэлігенцыі»: «Адміністратары валодаюць тут вялікай ініцыятывай і гнуткасцю розуму, навукоўцы захоўваюць у сваёй памяці масу звестак па вузкагаліновых пытаннях, эксперты прывучаныя разблытваць самыя складаныя аналогіі. І ўсе яны, уяўляючы з сябе карлікавых істот з пачварна гіпертрафаваным мозгам, выразна адрозніваюцца ад селенітаў-рамеснікаў альбо ваяроў».

Хіба гэта не карыкатура на зямную цывілізацыю?..

Месяц — гэта скалы і пяскі. Людзі імкнуцца да яго, ведама, не толькі для таго каб збіраць камяні. Хаця, як мы памятаем з Бібліі, на гэта таксама варта знайсці час.

# Улады прыйшлі да Макоўскай

Міністр Латушка і ўпаўнаважаны Гуляка ўпершыню прысутнічалі на З'ездзе беларусаў свету.

У Мінску прайшоў V З'езд беларусаў свету «Бацькаўшчына». Удзел у ім узялі 252 дэлегаты з 18 краінаў свету. Не толькі з суседніх краінаў, але і з ЗША, Канады, Брытаніі. Нават з Новай Зеландыі! Найбольш было з Расіі — 44. З'езды — рэдкая магчымасць пабачыцца на роднай зямлі.

Доўга «Бацькаўшчына» не магла знайсці памяшканне для з'езду, паўсюль сутыкалася з адмовамі. Кіраўнікі арганізацыі гатовыя былі зладзіць мерапрыемства ў Вільні. Толькі ў апошні момант залю атрымалі. І, на здзіўленне, на форум прыйшло шмат прадстаўнікоў улады.

У Адукацыйным цэнтры ІВВ прысутнічаў новы міністр культуры Павел Латушка, упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леанід Гуляка, намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур.

Перад канферэнц-цэнтрам Павел Латушка міла размаўляў з айцом Аляксандрам Надсанам. Міністр жыва цікавіўся, як там справы ў дыяспары ў Вялікабрытаніі. Увогуле, Латушка быў адкрыты, не адмаўляўся ні ад якіх кантактаў. Ці гэта быў студэнт з Вільні, ці кіраўнік Партыі БНФ на Магілёўшчыне Рыгор Костусеў.

Такія мерапрыемствы заўсёды пачынаюцца з гімнаў. З'езд «Бацькаўшчыны» не стаў выключэннем. Прагучаў не «Магутны Божа» і не цяперашні дзяржаўны, а мелодыя са старадаўняга «Полацкага сшытку». Такое вось кампраміснае рашэнне, у выніку якога ўсе засталіся задаволеныя.

Быў заслуханы аўдыёзварот старшыні Рады БНР Івонкі Сурвілы.

Пасля прамаўлялі Латушка і Гуляка. Гаварылі на добрай беларускай мове. Аднак, па праўдзе кажучы, абодва выступы аказаліся нуднымі. Абодва не ўклаліся ў адведзены для выступу час, спыніцца своечасова не змаглі, хоць увага залі не была ўжо на іх сканцэнтраваная.

Старшыня «Бацькаўшчыны» мастак Алесь Марачкін іранізаваў: маўляў, пасля такіх пазітыўных выступаў нават і прамаўляць ужо не хочацца. Марачкін прапанаваў вярнуць беларускай мове статус адзінай дзяржаўнай, а таксама закласці помнік у гонар 600-х угодкаў перамогі ў Грунвальдскай бітве.

Паводле гісторыка Наталлі Гардзіенка, сёння за межамі Беларусі жыве ад 2,5 да 3,5 мільёнаў асобаў беларускага паходжання.

Янка Запруднік акрэсліў праблемы, з якімі сутыкаецца сёння беларуская дыяспара ў ЗША. А Алег Рудакоў расказаў пра сітуацыю ў Іркуцку, дзе толькі афіцыйна налічваецца 50 тысяч нашых суайчыннікаў.

Потым трохвілінныя выступы мелі дэлегаты з'езду. Сонечнай атрымалася прамова прадстаўніка дыяспары ў Малдове Юрыя Статкевіча. Пры канцы ён падараваў прэзідыюму зборнік вершаў малдаўскіх паэтаў, выдадзеных па-беларуску, а таксама вялікую пляшку віна.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Чыноўнікам прыйшлося адказваць на непрыемныя пытанні.**
**На фота: упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей Леанід Гуляка.**

> Міністр Латушка «як грамадзянін» падтрымлівае ідэю вяртання беларускай мове статусу адзінай дзяржаўнай, заявіў ён на V З'ездзе беларусаў свету.

Цікава, што адразу за Юрыем Статкевічам слова ўзяў Юрка Станкевіч з Прагі, адзін з найстарэйшых удзельнікаў З'езду. Такое вось сугучча імёнаў.

Запомнілася таксама ахова памяшкання. Праз рослых хлопцаў не праскочыў бы і камар. Звярну ўвагу, як без лішніх словаў гэтыя хлопцы завярнулі пісьменніка Уладзіміра Арлова. «Тут выхад, а не ўваход. Заходзьце, дзе трэба». Парадак павінен быць ва ўсім.

Дарэчы, доўга гэтыя хлопцы не пускалі ў залу і былога міністра замежных справаў Пятра Краўчанку, пакуль той не зарэгістраваўся. Я падышоў да Пятра Кузьміча з просьбай пра інтэрв'ю, але палітык адразу сказаў, што з прэсай не кантактуе. Так і не ўдалося пацвердзіць інфармацыю пра ягоны магчымы ўдзел у прэзідэнцкай кампаніі.

Праца другога дня пачалася з пытанняў і адказаў: задавалі дэлегаты З'езду, адказвалі прадстаўнікі ўлады. Пыталіся ў Латушкі, ці не было б правільна зрабіць беларускую мову адзінай дзяржаўнай. Павел Паўлавіч зазначыў, што як грамадзянін ён гэта падтрымлівае, але як прадстаўнік уладаў не можа гаварыць так катэгарычна, бо прымусовае насаджэнне белмовы не прынясе жаданага выніку.

Не змог міністр адказаць толькі на пытанне адносна надання бел-чырвона-беламу сцягу вартасці гістарычнай каштоўнасці. Паабяцаў папрацаваць над гэтым пытаннем. Было дастаткова шмат непрыемных пытанняў, тым не менш Латушка глядзеўся годна.

У выступах большасць наракала на тое, што беларуская мова маргіналізуецца. Айцец Аляксандр Надсан адзначаў, што роднай гаворкі не пачуеш на вуліцах Мінску. Зінаіда Бандарэнка заклікала вярнуць мову на дзяржаўныя тэлеканалы, а старшыня ТБМ Алег Трусаў прапанаваў зрабіць 2010 год годам беларускай мовы.

Здаецца, гэта не вельмі падабалася Леаніду Гуляку. Пасля з'езду ён зазначыў, што хацеў бы чуць больш прапановаў адносна эканамічнага супрацоўніцтва. Упор на гэта рабілі і прадстаўнікі дзяржаўных тэлеканалаў.

Дарэчы, упершыню за доўгі час і ТВ, і агенцтва БЕЛТА аддалі асвятленню З'езду вялікае

> З'езд беларусаў свету заклікаў вярнуць беларускай мове статус адзінай дзяржаўнай.

месца.

Неаднаразова са сцэны гучалі заклікі не палітызаваць мерапрыемства. Пра гэта казаў старшыня Таварыства аховы помнікаў Антон Астаповіч. Аляксей Марачкін на гэта пярэчыў: «Так, мы не палітычная арганізацыя. Але хіба мы мусім маўчаць пра палітвязняў, палітуцекачоў?».

Усе чакалі, ці прапануе Марачкін падтрымаць ініцыятыву Аляксандра Казуліна «Беларускі дом». Не, гэтага не здарылася. Казулін прысутнічаў на З'ездзе абодва дні. У першы з'явіўся ў суправаджэнні старшыні АГП Анатоля Лябедзькі.

Была ўхваленая прапанова зрабіць наступны год годам Ларысы Геніюш, чый стогадовы юбілей будзе адзначацца.

У выніку на пасаду старшыні «Бацькаўшчыны» на безальтэрнатыўнай аснове была выбрана Алена Макоўская. Хведар Нюнька з Вільні зазначыў, што спн. Алена з'яўляецца не толькі добрым і руплівым работнікам, але і ўвасабляе ўсю прыгажосць беларусак. Супраць Макоўскай не галасаваў ніхто, толькі два чалавекі ўстрымаліся.

Галантны Уладзімір Арлоў адразу ж падарыў новай старшыні прыгожы бел-чырвона-белы букет. Такі самы букет атрымала і новая кіраўніца Рады «Бацькаўшчыны» Ніна Шыдлоўская. Сама Макоўская зазначыла, што для яе гэта вялікі гонар, і яна спадзяецца, што апраўдае выдадзены ёй крэдыт даверу.

**Зміцер Панкавец**

# Алена Макоўская: Заканамерна, што нас пачулі

Пасля абрання на пасаду старшыні ЗБС «Бацькаўшчына» Алена Макоўская адказала на пытанні «НН».

**«Наша Ніва»: Задаволеная працай З'езду?**

**Алена Макоўская:** Арганізатару цяжка выказаць аб'ектыўнае меркаванне. Мы перажывалі за тое, каб усё прайшло на высокім узроўні.

**«НН»: А як Вам прадстаўнічасць уладаў на мерапрыемстве?**

**АМ:** «Бацькаўшчына» доўгі час апелявала да ўладаў у плане вырашэння пытанняў дыяспары. Я лічу заканамерным, што нас нарэшце пачулі і да нас прыйшлі міністр культуры, упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў.

**«НН»: А ў чым у будучыні могуць перасякацца інтарэсы «Бацькаўшчыны» і дзяржаўных установаў?**

**АМ:** Сябры нашай арганізацыі раскіданыя па ўсіх кантынентах. Гэта людзі розных поглядаў, канфесій, пакаленняў. Аднак іх аб'ядноўвае любоў да сваёй краіны. Дзяржаўны інтарэс заключаецца ў падтрымцы гэтых людзей, бо гэта наш інтэлектуальны патэнцыял, яны могуць ствараць пазітыўны імідж краіны ў свеце.

**«НН»: Леанід Гуляка выказаў шкадаванне, што не прагучала прапановаў супрацоўніцтва ў эканамічнай галіне.**

**АМ:** Такое пытанне можа і павінное стаяць. Была секцыя бізнэсмэнаў, дзе бралі ўдзел як прадстаўнікі дыяспары, так і нацыянальнага бізнэсу. Гэта і можа быць першым крокам у супрацоўніцтве. Але першы крок насустрач беларусам замежжа павінная зрабіць дзяржава.

**«НН»: Перад З'ездам было шмат размоваў адносна прыходу ў арганізацыю Аляксандра Казуліна...**

**АМ:** Размоваў было шмат. Але давайце рэальна глядзець на рэчы. З'езд прайшоў канструктыўна, станоўча, прынятыя дакументы. Людзі задаволеныя, і гэта самае галоўнае.

**«НН»: Чакалі такой адзінагалоснай падтрымкі?**

**АМ:** Я не думала пра гэта, але мне было надзвычай прыемна.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Алена Макоўская**
нарадзілася ў 1972 у Кобрыне. Скончыла Лінгвістычны універсітэт і Акадэмію кіравання. Адразу па атрыманні вышэйшай адукацыі — у 1994 — прыйшла працаваць у Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына». На III з'ездзе беларусаў свету ў 2001 годзе абраная на пасаду старшыні Рады «Бацькаўшчыны». Ад ліпеня 2009 году — старшыня арганізацыі.

**Гутарыў**
**Зміцер Панкавец**

# Класік урадавай думкі

**Змяняюцца ўрады, сыходзяць з арэны палітыкі, забываюцца імёны парламенцкіх аратараў. А Мясніковіч застаецца. Піша Аляксандр Фядута.**

### Не крыўдуйце, спадар Мясніковіч!

Вырасла цэлае пакаленне, якое паспела забыць пра існаванне Мінскага гаркаму партыі. Для гэтай моладзі Мясніковіч — галоўны навуковец краіны. І не болей. А былі ж часіны!..

Кажуць, што на Мясніковіча звярнулі ўвагу падчас чарговага ўрадавага пахавання. Ён працаваў тады галоўным інжынерам сталічнай спецгаспадаркі. Па спецыяльнасці, так бы мовіць. Малады працаўнік сферы ЖКГ пачаў хутка рабіць кар'еру — і даслужыўся да сакратара Мінскага гаркаму КПБ. Адтуль простая дарога вяла ў міністры — балазе, старшынём Савету Міністраў стаў спярша Міхаіл Кавалёў (старшыня Мінгарвыканкаму), а потым Вячаслаў Кебіч, чыя кар'ера таксама была звязаная з Мінскам.

І вось Мясніковіч стаў спярша міністрам жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Потым — першым намеснікам Дзяржплану БССР (старшынём у рангу віцэ-прэм'ера быў якраз Вячаслаў Кебіч). І, нарэшце, калі Кебіч сам узначаліў урад, Мясніковіч стаў яго правай рукой на пасадзе першага намесніка.

У тыя легендарныя часы я блізка бачыў Мясніковіча толькі раз. Ішло бюро ЦК КПБ, абмяркоўвалі салігорскія забастоўкі (красавік 1991). На фоне пыхлівага Малафеева і Дземянцея, што спалохана стагнаў, уражанне дзелавых і ўраўнаважаных людзей ствaралі ўсяго тры чалавекі. Прафсаюзнік Уладзімір Ганчарык, сакратар ЦК КПБ па пытаннях прамысловасці Артур Трутнеў і — Мясніковіч. Яму не трэба было зазіраць у паперкі. Ён памятаў лічбы і ведаў сутнасць рашэнняў.

Такім ён быў заўсёды.

Таму Кебіч планаваў зрабіць яго прэм'ерам пасля перамогі на прэзідэнцкіх выбарах, а Лукашэнка пакінуў у віцэ-прэм'ерах, абазваўшы, падчас прадстаўлення ў Вярхоўным Савеце, радыкалам-рыначнікам.

І Мясніковіч не зніякавеў пасля паніжэння ў статусе (у простыя віцэ-прэм'еры). Хто, калі не ён, ведаў: лепш простым віцэ-прэм'ерам быць, чым палітычным нябожчыкам. Пэўна ж, досвед удзелу ва ўрадавых пахаваннях быў ...

Добра разумеючы, з якім падазрэннем паглядае на яго гэтая зграя, што дарвалася да ўлады, Мясніковіч працаваў бездакорна. Настолькі, што праз год, калі Лукашэнка вырашыў нарэшце развітацца з Леанідам Сініцыным, архітэктарам сваёй перамогі, ён проста памяняў Мясніковіча і Сініцына месцамі. Так няспраўджаны прэм'ер за Кебічам стаў кіраўніком Адміністрацыі за Лукашэнкам.

### Найлепшы інжынер-будаўнік

Гэта не перабольшанне. Выпускнік Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута, Мясніковіч рыхтаваўся будаваць дамы, а ўмудрыўся пабудаваць дзяржаву. Бо галоўнай яго справай на пасадзе кіраўніка Адміністрацыі стаў рэферэндум 1996 г. аб змене Канстытуцыі.

У 1994 г., падчас перадвыбарчай сустрэчы Лукашэнкі з выбаршчыкамі — працаўнікамі цэнтральнага апарату КДБ, — запыталі: «Што Вы зробіце пасля свайго прыходу да ўлады з самым багатым чалавекам Беларусі — Міхаілам Мясніковічам?»

Кандыдат усміхнуўся і адказаў: «Тое, чаго ён заслугоўвае».

А чаго заслугоўваў Мясніковіч? Ён сам, імаверна, ведаў лепш за іншых. Ён заслугоўваў улады.

Рэферэндум 1996 году выйграў не Лукашэнка. Ён не выйграваў рэферэндумы — іх яму выйгравалі іншыя. Рэферэндум 1995 году яму выйграў Замяталін. Рэферэндум 2004 году яму выйграў Латыпаў. А 1996-га — выйграў Мясніковіч.

І калі пасля выбараў 2001 г., у якіх Мясніковіч на пасадзе кіраўніка Адміністрацыі адыграў ролю архітэктара перамогі, яго накіравалі ў адстаўку. Мне апавядалі, як ён ішоў з прэзідэнцкага кабінету, з яшчэ цямнейшым, чым звычайна, тварам, змрочны, пацяжэлы, амаль трымаючыся рукой за сценку. Хвіліну таму ён мог разлічваць на найвышэйшую ўдзячнасць, а тут...

— За Мясніковіча не перажывай! — з'едліва сказаў мне іншы адстаўны архітэктар. — Яму места знойдзецца. Вось хаця б прэзідэнта Акадэміі навук. Пустуе ўжо колькі часу!

Я пасмяяўся. Як паказаў час — дарма. Здольнасці непатапляльнага Мясніковіча былі запатрабаваныя на новым полі дзейнасці.

### Галоўны навуковец краіны

Што такое ўлада, паважаныя чытачы? Грошы? Хадаркоўскі толькі пасмяецца. Пасада? Дэн Сяапін захоўваў уплыў нават пасля сыходу з усіх пасадаў у краіне. Тады — што?

Магчымасць набраць нумар — і табе адкажуць, вось што такое ўлада. Проста тэлефонаў такіх няшмат.

Мясніковічу было важна не толькі ацалець, але і захаваць права карыстацца «тройкай». Любому чыноўніку да лямпачкі, якую пасаду займае Мясніковіч, калі ён звоніць па ўрадавай сувязі. Таму што ўлада знаходзіцца на тым канцы дроту, з якога гаворыць Мясніковіч. Калі толькі, канечне, ён не размаўляе ў гэты момант з Лукашэнкам.

Мясніковіч стаў прэзідэнтам Акадэміі навук — няхай нават дзеля гэтага давялося выціснуць у апазіцыю папярэдніка Вайтовіча. Гэта была ягоная першая перамога. Вайтовіч адмовіўся прадстаўляць Мясніковіча сходу Акадэміі — нічога. Абышліся Латыпавым. Гэта ў той момант было нават важней.

Мясніковіч ведаў: не варта ламіцца ў дзверы акадэмічнай супольнасці. Трэба давесці акадэмікам, што ты можаш адстойваць і іх асабістыя, і карпаратыўныя інтарэсы, і інтарэсы беларускай навукі эфектыўней за любога іншага. А ступень эфектыўнасці мэнэджмэнту не толькі ў навуцы, але і ў любой іншай сферы жыцця вымяраецца магчымасцю прыцягнуць дадатковыя сродкі.

А вось у гэтым мастацтве ў Мясніковіча не было роўні. Нездарма менавіта яму Кебіч, а затым і Лукашэнка давяралі перамовы з міжнароднымі фінансавымі арганізацыямі. І калі Мясніковіч мог размаўляць на роўных з мацёрымі банкірамі, дык ужо з дамарослымі беларускімі фінансістамі тым болей.

Праўда, грошы яму былі патрэбныя не на ўсе галіны навукі ў роўнай ступені. Вось абаронка, энэргетыка, космас — гэта так! Гэта — інвестыцыйна прывабныя сферы.

Ва ўсе часы партыйнага панавання адным з самых уплывовых чальцоў Палітбюро быў куратар абароннай прамысловасці. Бюджэт абароннага комплексу быў роўны бюджэту ўсёй астатняй часткі СССР. Было што «пілаваць»!

Мясніковіч пераканаў прэзідэнта ў неабходнасці двух праектаў. Першы — іміджавы. Уласны спадарожнік. На які ляд ён трэба Беларусі, мог уцямна патлумачыць толькі ён сам. Трэба — і ўсё. Расія — радзіма сланоў, Лукашэнка — бацька беларускага спадарожніка. Народ узрадуецца, Аляксандр Рыгоравіч!

І нават тое, што спадарожнік гэты зваліўся, нікога не пераймала. У няўдачы, як і заўсёды, вінаватая была Расія — іх жа ракета не данесла да арбіты наш цуд тэхнікі!

І другі праект — уласная АЭС. Яе Мясніковіч лабіраваў, па чутках, удзень і ўначы. Яшчэ б! Такія аб'ёмы фінансавання! І галоўнае: прэзідэнту не трэба тлумачыць ролю энэргетыкі ў забяспячэнні беларускага эканамічнага цуду.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

У гэтай якасці Мясніковіч стаў проста знаходкай для НАН. З'явіліся грошы — пайшлі рамонты, пачалося фінансаванне сякой-такой эксперыментальнай базы.

Пры гэтым палітычных рэпрэсіяў у Акадэміі амаль не было. Ну, пераправы «ястрабаў» — пераразлі гісторыкаў, што раз'ехаліся па замежжах. Дык няма чаго калегаў дражніць — якіх нікуды не запрашаюць. А некаторыя апазіцыянеры — што адышлі ад актыўнай дзейнасці, — атрымалі магчымасць спакойна корпацца ў чарапках і культурных слаях, апісваць сельскую грамаду як папярэдніцу аграгарадкоў...

Карацей, навукоўцы Мясніковіча палюбілі.

Але трэ было абірацца акадэмікам ці хаця б членкарам. А тут у Мясніковіча быў уплывовы апанент — навуковы сакратар АН Мікалай Казак. Навуковец з імем, ён ніяк не жадаў змірыцца, што новы шэф нават і доктарам быў нейкім... палітычным, ці што. І тут падышлі выбары.

Нечакана Казака вылучылі па адной акрузе з Вольгай Абрамавай.

Шмат гадоў хадзілі чуткі, што просьба не перашкаджаць ёй абірацца ў палату зыходзіла ад Мясніковіча. І ў той момант, калі Казак у парламенце спатрэбіўся яму болей, лідэр апалага беларускага «Яблыка» выбары прайграла — хоць з акругай працавала як праклятая. А Казак, які сышоў у парламент, перастаў трымаць у руках рэальныя адміністрацыйныя рычагі — і Мясніковіч спакойна абраўся членкарам.

### Дамоклаў меч

У імператарскай Расіі прэзідэнт Акадэміі навук быў чальцом Дзяржаўнае Рады. У СССР ён быў чальцом ЦК КПСС — не болей. Чаму ж, спытае шаноўны чытач, спадар Фядута залічвае старшыню прэзідыюму НАН да ліку чальцоў нефармальнага «Палітбюро»?

Справа не ў пасадзе. Справа ў Мясніковічу.

Яго знаходжанне на любой урадавай пасадзе — дамоклаў меч, найперш над галавой старшыні ўраду. Мясніковіч, з яго велізарным адміністрацыйным досведам — кандыдатура на пасаду прэм'ера.

А найлепшая гарантыя лаяльнасці Мясніковіча — гады. Лукашэнка пастарэў, а Мясніковіч што — памаладзеў? Гэты разумны чалавек добра ведае, што такое жыццё. Жыццё — усяго толькі маршрут з могілак на могілкі. Дзе пачаў рабіць кар'еру, там рана ці позна і вечны спакой знойдзеш. Галоўнае — па-філасофску ставіцца да жыцця. Нездарма акрамя Мясніковіча з далукашэнкаўскіх часоў у беларускай палітыцы застаўся хіба што ўладыка Філарэт.

А калі жыццё адно, то пражыць яго трэба так, каб не было пакутліва балюча і...

Не, гэта цытата не з працаў членакарэспандэнта НАН Мясніковіча М.У. З іншага класіка. Варта было б замяніць яго Мясніковічам.

І шмат каго яшчэ можна было б замяніць Мясніковічам.

І раней ці пазней — заменяць! А пакуль няхай павісіць.

# Памежнік «чытаў Жывы Дзённік Адамовіча і абураўся»

**Паэт–блукальнік Славамір Адамовіч вярнуўся на радзіму.**

Знакаміты паэт Славамір Адамовіч, які 7 гадоў пражыў у Нарвегіі ў статусе ўцекача, меўся ў суботу перасячы польска-беларускую мяжу. Але пакуль паэт не аб'явіўся.

Адамовіч перад гэтым неаднаразова прадказваў «скандал», бо вяртаецца без неабходных дакументаў. Тэрмін дзеяння ягонага беларускага пашпарту скончыўся яшчэ ў 2007 годзе, а дабрацца да консульства ў Стакгольме ў яго не было сродкаў.

У прэс-службе Дзяржаўнага памежнага камітэту Беларусі «Нашай Ніве» адказалі, што грамадзянін Адамовіч Славамір без усялякіх праблемаў перасек мяжу 18 ліпеня ў Гродне.

Кіраўнік прэс-службы Аляксандр Ціщчанка быў абураны паводзінамі Адамовіча перад прыездам. Ён сказаў, што чытаў у інтэрнэце Жывы Дзённік Адамовіча і не разумее заявы паэта наконт таго, што яго нібыта могуць не пусціць у Беларусь. «Кожны грамадзянін Беларусі можа вярнуцца ў сваю краіну, нават калі тэрмін дзеяння пашпарту скончыўся».

Датэлефанавацца да самога паэта мы пакуль не здолелі. Яго нарвежскі тэлефон у панядзелак быў адключаны. Нумар ягонай сястры не адказваў, а мама Юзэфа ў Альхоўцы (Мядзельскі раён) тэлефона не мае.

Спадзяемся, што ў выдатнага паэта ўсё добра і ён проста ўзяў паўзу, вярнуўшыся нарэшце дахаты пасля шматгадовых блуканняў. А свая хатка — яна ж як родная матка.




**Вольга Жарнасек**

# У саборы Глыбокага знайшлі чалавечыя парэшткі

На мінулым тыдні Аб'яднанне моладзі Беларускай праваслаўнай царквы правяло летнік у Глыбокім. Падчас чысткі сутарэнняў сабору Раства Багародзіцы былі знойдзеныя чалавечыя парэшткі.



Настаяцель царквы айцец Сергій Грамыка ўгледжвае прыкметы таго, што людзі памерлі гвалтоўнай смерцю. Але святар адзначае, што слядоў ад куляў не відаць.

Частка трупаў не мае на сабе вопраткі і абутак. Дакладную колькасць загінулых палічыць цяжка. Сярод знойдзеных асабістых рэчаў быў пачак ад цыгарэтаў з польскімі надпісамі.

Верагодна, людзі загінулі не пазней за 1939 год.

Краязнаўца Уладзімір Скрабатун расказвае, што сутарэнні пад царквой вялікія. Яны ніколі не даследаваліся, і колькасць падобных пахаванняў можа ўзрасці пры далейшых пошуках.

Пакуль парэшткі застаюцца ў царкве. Пракуратура Глыбокага распачала следства.

**Сяргей Макарэвіч**

# Фрунзенскі суд Мінска выставіў на таргі казла і пяць козаў

У такі спосаб рэалізуецца канфіскаваная маёмасць. А крамы канфіскату браць да сябе козаў не наважыліся, таму суд і вырашыў прадаць жывёлу на аўкцыёне.

Пачатковая цана складае ад 100 000 рублёў за адну галаву.

**Dr0p-of-sun.livejournal.com**

# На Львоўшчыне ажывілі дывізію «Галіччына»

**19 ліпеня каля в. Чырвонае Львоўскай вобласці прайшлі ўрачыстасці з нагоды 65–й гадавіны баёў дывізіі СС «Галіччына».**

Таксама была праведзеная рэканструкцыя баёў падчас вайны на месцы г.зв. «Бродаўскага катла».



Удзельнікі ўрачыстасцяў правялі цырымонію перапахавання байцоў «Галіччыны». Прысутнічалі і ветэраны дывізіі.

У пачатку ліпеня 1944 г., калі нямецкія часткі ледзь стрымлівалі прасоўванне савецкіх войскаў, пад Броды перакінулі Украінскую дывізію СС «Галіччына».

Сфармаваная ў 1943 г. з украінцаў-галіччан, дывізія заняла найбольш небяспечны ўчастак фронту ў тым раёне. Падчас баёў «Галіччына» і восем нямецкіх дывізій трапілі ў атачэнне, г.зв. «Бродаўскі кацёл». Толькі чацвертай частцы байцоў удалося вырвацца з атачэння.

Украінскія нацыяналісты разглядаюць дывізію як вымушаную форму змагання за незалежнасць Украіны ва ўмовах, калі краіна апынулася між молатам і кавадлам. Для Саветаў фармаванне было сімвалам калабарацыі Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў з нацыстамі.

Дывізія ў канцы вайны здалася саюзнікам. Яе байцоў разглядалі як ваеннапалонных, а не як ваенных злачынцаў. Ваяры «Галіччыны» склалі ядро ўкраінскай палітычнай эміграцыі пасля вайны.

**МБ; АГ**



# Калі б выцекла ў будзень, спекліся б дзесяткі

Адзін чалавек загінуў, чацвёра атрымалі апёкі ў выніку ўцечкі аміяку на Слуцкім мясакамбінаце. У выніку разгерметызацыі трубаправоду халадзільнай камеры 200 кілаграмаў рэчыва выцекла ў цэх. 50 ратавальнікаў асаджвалі аміяк з дапамогай «воднай заслоны» і адпампоўвалі аміячную ваду. На думку супрацоўнікаў прадпрыемства, ахвяраў было б нашмат болей, каб аварыя здарылася ў будні дзень.

**МБ**

# Найвышэйшыя цэны ў Еўропе — у Даніі

**Найтанней — у Македоніі. Але выбіраючы між Даніяй і Македоніяй, многія выбралі б першую.**

Самыя танныя тавары і паслугі ў Еўропе — у Македоніі, самыя дарагія — у Даніі. Такія звесткі абнародавала статыстычнае агенцтва Eurostat. У Македоніі цэны на 53% ніжэйшыя за сярэднія па Еўропе, а ў Даніі ўзровень спажывецкіх цэн вышэйшы за сярэднееўрапейскі на 41%.

У ліку самых дарагіх краін Еўропы названыя таксама Нарвегія і Швейцарыя, дзе паказчык спажывецкіх цэн на 39 і 30% вышэйшы за сярэднееўрапейскі.

З дзяржаваў ЕС самыя танныя тавары і паслугі — у Балгарыі, дзе спажывецкія цэны ніжэйшыя за сярэднееўрапейскія на 49%.

Eurostat даследаваў 37 краін: 27 дзяржаваў ЕС, тры краіны — кандыдаты ў ЕС (Турцыя, Харватыя, Македонія), а таксама краіны — чальцы Еўрапейскай асацыяцыі свабоднага гандлю (Ісландыя, Нарвегія, Швейцарыя), Албанію, Боснію і Герцагавіну, Сербію, Чарнагорыю. Беларусь пакуль не разглядаецца як краіна еўрапейскай прасторы.

**БелаПАН; МБ**

## СЦІСЛА

### Чорны ўік-энд

За мінулыя выходныя ў Беларусі адбылося 56 ДТЗ, у якіх 11 чалавек загінулі і 63 атрымалі раненні. Пра гэта паведамляе ўпраўленне Дзяржаўтаінспекцыі МУС.

### На Свіцязі маланка забіла 7-гадовае дзіця

Ад залеваў, навальніц і парывістага ветру, якія 19 ліпеня прынёс у Беларусь халодны атмасферны фронт, пацярпелі Брэсцкая, Гродзенская, Мінская і Магілёўская вобласці. Трагедыя здарылася на возеры Свіцязь, што пад Наваградкам. Там загінула дзіця 2001 году нараджэння. Маланка трапіла ў дрэва, дзе дзіця з бацькамі хавалася ад навальніцы. Дрэва ўпала і раздушыла яго.

Дарэчы, два тыдні таму ў Стоўбцах (Мінская вобласць) маланка забіла двух падлеткаў, якія таксама хаваліся пад дрэвам.

**АГ; БелаПАН**

## Беларускамоўнае вяселле ў Глыбокім

**15 ліпеня, упершыню за апошнія 16 гадоў, у Глыбокім адбылося беларускамоўнае вяселле, пра што паведаміла прысутным супрацоўніца глыбоцкага ЗАГСу на ўрачыстай рэгістрацыі гэтага шлюбу.**

Пабраліся шлюбам Надзея Бабіч і Андрэй Храпавіцкі. І тут такая цікавостка: абое нарадзіліся ў адзін дзень — 15 ліпеня, да гэта ж дня — хоць і была серада — прымеркавалі заключэнне шлюбу. Абое па адукацыі — выкладчыкі англійскай мовы, абое атрымліваюць другую вышэйшую адукацыю ў ЕГУ (Вільня), паходзяць з сем'яў настаўнікаў.

Надзея акрамя таго была сярод тых, хто ў 2006 годзе да апошніх хвілінаў знаходзіўся ў намётавым мястэчку на пляцы Каліноўскага, за што атрымала чатыры дні адсідкі. Андрэй Храпавіцкі — паэт. Яго вершы публікаваліся ў шматлікіх выданнях, у тым ліку і ў «Нашай Ніве».



Вясельны стол.



Маладыя вянчаліся ў задарожскім касцёле.





У глыбоцкім ЗАГСе.

Пасля ўрачыстай рэгістрацыі шлюбу маладыя накіраваліся ў задарожскі касцёл Найсвяцейшай Марыі Панны Ласкавай (за 25 км ад Глыбокага), дзе адбылося вянчанне. Надзея (праваслаўная) дала абяцанне выхоўваць будучых дзяцей паводле каталіцкіх традыцыяў.

Дарэчы, у задарожскім касцёле бывў хрышчаны Вацлаў Ластоўскі, будучы гісторык і прэм'ер Беларускай Народнай Рэспублікі. Побач з касцёлам — пахаванні Грынеўскіх. Маёнтак Якубенкі (за 4 км ад касцёлу) належаў Эўзэбію (Яўсею) Грынеўскаму, дзеду Аляксандра Грынеўскага (Грына), аўтара «Пунсовых ветразяў».

Вясельны стол адбыўся на аграсядзібе Юліі Бука ў вёсцы Валодзькава, што на беразе вялікага Акунёўскага возера. Чаму тут, а не ў рэстарацыі? Найперш — вельмі танна! Юлія робіць зніжкі беларускамоўным. Вясельны стол быў спрэс беларускамоўны, як віншаванні і прамовы вядоўцы (бацькі Надзеі), так і віншаванні ды тосты прысутных маладзёнаў, якія яшчэ колькі гадзінаў таму былі расійскамоўнымі. Некаторыя нават пераапрануліся ў футболкі з Пагоняй. Музыка: «Песняры», «Стары Ольса», «Крама», колькі англамоўны хітоў… З Глыбокага прыехаў беларускамоўны спявак Павел Пеляёнак. Беларускі песенны рэпертуар быў самадастатковы і ні ў кога не выклікаў пярэчанняў праз адсутнасць расійскамоўных хітоў.

Пакуль Андрусь прымаў пажаданні і віншаванні гасцёў — страціў пільнасць. У яго незаўважна скралі нявесту (ужо жонку) ды звезлі на Акунёўскае возера, запатрабаўшы неймаверна вялікі выкуп. Шмат высілкаў каштавала Андрусю і яго сведку Астапу, мінчуку і студэнту Віленскага універсітэта, вярнуць жонку.

Зрэшты, на гэтым можна і скончыць… Нарадзілася яшчэ адна свядомая беларуская сям'я. Не выклікае сумневу — такімі ж будуць і іх дзеці. Шчасця вам, маладыя! — Сто лят! Сто лят! Сто лят!— спявалі дзве іх бабулі традыцыйную для заходу Беларусі песню.

**Уладзімір Скрабатун, Глыбокае**

## Варварства ў ягадах

**Лес — наша багацце. Гэта не парожняя фраза.** Сёлета ў нашых лясах нарасло багата чарніц, і, каб трохі прыдбаць грошай люд кінуўся на збіранне дзікарослых.

Але збіранне часта і ўсё болей набывае варварскія формы. Пераважная бальшыня зборшчыкаў ужывае для збору чарніц адмысловыя грабянцы. Налета пасля такіх грабянцоў ягад не будзе, бо яны аблузваюць разам з пладамі і лісце. Экалагічная служба робіць рэйды, штрафуе за грабянцы. Надоечы злавілі ў ягадніку з такім агрэгатам нават дырэктарку школы, далі мільён штрафу, але тая, кажуць, праз карупцыйны ланцужок здолела знізіць памер кары да трыццаці тысяч.

Другая бяда — засмечванне лесу пластыкам з бутэлек. Ніхто не забірае іх з лесу назад. Калі так будзе далей, то пляшак праз колькі гадоў будзе болей, чым ягад. Тут ужо трэ штрафаваць гандаль за нерганізацыю збору каштоўнай сыравіны і жорсткага смецця.

Варварскіх зборшчыкаў багата, экалагістаў мала. Дзе ж гэнае славутае «патрыятычнае выхаванне» і ягоны плён?

**Мікола Бусел, Дуброва**

## Каланіяльны сіндром у Полацку

...Ужо калі вярхоўны галоўнакамандуючы падчас «малочнай вайны» канстатаваў, што яго «вертыкальныя» не ўмеюць думаць як чыноўнікі незалежнай дзяржавы, нам пагатоў можна казаць, што яны, гэтыя «вертыкальныя», па-ранейшаму хварэюць на каланіяльны сіндром. Бо калі б думалі магілёўскія чыноўнікі ў беларускіх нацыянальных катэгорыях, ніколі не згадзіліся б прыняць ад маскоўскіх пабрацімаў бюст Мікалая ІІ. Бетліва, але недвухсэнсоўна адмовіліся б ад такога падарунка.

Вось і полацкая «вертыкаль» прадэманстравала недамысленнасць, калі аднойчы спакусілася на расійскую прапанову паставіць у горадзе помнік «во славу русского оружия», а менавіта — помнік расійскім салдатам, якія ў 1812 годзе «приступом взяли сей град». Так сказаць, вызвалілі яго ад французскага акупанта.

І якая такая слава «русского оружия» была прадэманстраваная ў 1812 годзе? Шэраг дробных сутычак? Барадзінская бітва, якую невядома хто выйграў? Марныя ахвяры: адны мусілі здаць Маскву, а другія не здолелі замацавацца ў ёй. Гэта ж паказальна, што вырашальныя бітвы, у якіх вызначыўся лёс французскай імперыі, адбыліся толькі тады, калі да расійскай арміі далучыліся аўстрыйскае, прускае ды шведскае войскі. Славутая бітва народаў пад Ляйпцыгам адбылася амаль праз год пасля прыходу расійскага войска ў Полацк.

Што адбылося ў 1812 годзе? Адбылася, па вялікім рахунку, трагедыя мільёнаў — беларусаў, расійцаў, палякаў, французаў, немцаў… Услаўляць вайну, рамантызаваць гібель і пакуты мільёнаў? Гэта мысленне даўно мінулых дзён. Калі б полацкая «вертыкаль» думала па-сучаснаму, пачалавечы, па-хрысціянску урэшце, яна, адказваючы на расійскую прапазіцыю, прапанавала б усходнім суседзям паставіць у горадзе не помнік у славу якой бы там ні было зброі, а помнік ахвярам вайны 1812 году. Гэта было б у духу вялікай палачанкі Еўфрасінні.

...Пакуль полацкая «вертыкаль» завіхаецца ля помніка «во славу русского оружия», слаўная полацкая Сафія тэрмінова патрабуе дапамогі. Кепска адладжаная сістэма вадасцёку вядзе да таго, што вада сцякае долу не па трубах, а па сценах сабору. Гэта не можа не выклікаць трывогу кожнага культурнага чалавека.

**Анатоль Сідарэвіч**

### МОВА—2009

## Зберажэм набытае!

Усё часцей можна напаткаць слова *каторы* на месцы замацаваных у літаратурным ужытку адносных займеннікаў *які, што*. Напрыклад: «Крызіс абвастрыў праблемы, *каторыя* і дагэтуль былі актуальныя».

Паказанае адхіленне ад літаратурнай нормы назіраецца ў мове як дзяржаўных, так і недзяржаўных СМІ. Надта прыкра, што гэтае слова робіцца модным у маўленні людзей маладых — з талентам і ўжо з імёнамі.

Можна разважаць, да якой мовы — рускай ці польскай — мы набліжаемся ў такім разе, але відавочна і бясспрэчна: аддаляемся ад сваёй роднай…

**Алесь Каўрус, Мінск**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск. e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**

# Што Еўрапейскі Саюз можа даць Беларусі

У Еўрапейскага Саюзу асаблівыя стасункі са сваімі найбліжэйшымі суседзямі на ўсходніх і паўднёвых межах. Гэта завецца еўрапейскай палітыкай добрасуседства. Праз гэтую палітыку ЕС падтрымлівае працэсы палітычных, эканамічных і сацыяльных рэформ у суседзяў. Краіна мае рэальную магчымасць зрабіцца актыўным партнёрам ЕС у рамках ЕПД пры ўмове, што стане на шлях істотных дэмакратычных і эканамічных рэформаў і наблізіцца да супольных каштоўнасцяў. у пачатковай стадыі Беларусь можа браць удзел у мерапрыемствах шматбаковых праграм.

Вось карысць, якую можа прынесці Усходняе Партнёрства:

— спрошчанае наведванне беларускімі грамадзянамі краін-сябраў ЕС;

— пашыранае трансмежнае супрацоўніцтва;

— дапамога ў развіцці малога і сярэдняга прадпрымальніцтва і падрыхтоўка беларускіх прадпрыемстваў да працы на еўрапейскім рынку;

— паляпшэнне сістэмы аховы здароўя і адукацыі;

— зрабіць дзяржаўнае і мясцовае кіраванне больш эфектыўным для лепшай якасці паслуг насельніцтву;

— рэфармаваць прававую і судовую сістэмы з мэтай забяспечання роўных правоў для ўсіх;

— лепшыя эканамічныя магчымасці для Беларусі праз мадэрнізацыю транспартнай і энэргетычнай сістэмы;

— палепшыць стан навакольнага асяроддзя: якасць вады, утылізацыя выкідаў, падтрымка ў барацьбе з наступствамі Чарнобыльскай катастрофы;

— беларускім студэнтам — больш стыпендый для навучання ва універсітэтах ЕС;

— глыбейшыя эканамічныя і гандлёвыя сувязі і больш магчымасцяў для бізнэсу:

— лепшы доступ беларускіх прадуктаў да рынку ЕС;

Беларусь атрымала значна менш фінансавай дапамогі, чым яе суседзі. Але сітуацыя магла б змяніцца, калі б беларускія ўлады зрабілі крокі насустрач дэмакратызацыі.

### Што ўрад Беларусі можа зрабіць

Палітыка, якая праводзіцца аўтарытарным рэжымам, не дазваляе ЕС прапанаваць Беларусі поўны ўдзел у палітыцы добрасуседства. Народ Беларусі — самая першая ахвяра ізаляцыі, навязанай яму афіцыйнай ўладай, але ён жа будзе першым, хто скарыстаецца перавагамі прапановаў для дэмакратычнай Беларусі.

ЕС прапануе палітычныя, эканамічныя і гандлёвыя магчымасці, таксама як і фінансавую дапамогу краінам, якія паважаюць правы чалавека, дэмакратыю і верхавенства закону. Гэта каштоўнасці, якія Беларусь ужо прызнала як сябра ААН, АБСЕ, але якія беларускі ўрад на практыцы не паважае. У ранейшых дакументах ЕС акрэсліваў свае патрабаванні да беларускіх уладаў. Для пабудовы больш шчыльных стасункаў, паміж ЕС і народам Беларусі, для спынення палітыкі самаізаляцыі, якую беларускі ўрад навязаў грамадзянам, беларускім уладам трэба:

— паважаць права народа Беларусі выбіраць сваіх лідэраў дэмакратычным шляхам;

— паважаць права народа Беларусі на незалежную інфармацыю, дазваляючы журналістам працаваць без ціску, не закрываючы газетаў і не перашкаджаючы іх распаўсюду;

— паважаць правы недзяржаўных арганізацый як жыццёва важнай часткі здаровай дэмакратыі;

— вызваліць усіх палітычных зняволеных;

— расследаваць выпадкі знікнення людзей;

— забяспечыць права беларусаў на незалежную і непрадузятую судовую сістэму;

— спыніць адвольныя арышты і затрыманні, дрэннае абыходжанне з людзьмі;

— паважаць правы і свабоды нацыянальных меншасцяў Беларусі;

— паважаць правы беларусаў уступаць у прафсаюзы і права прафсаюзаў працаваць на абарону правоў людзей;

— паважаць правы беларусаў як прадпрымальнікаў ажыццяўляць дзейнасць без празмернага ўмяшання ўладаў;

— далучыцца да скасавання смяротнай кары ўслед за іншымі народамі Еўропы;

— выкарыстаць падтрымку, якую АБСЕ, ЕС і іншыя арганізацыі прапануюць Беларусі для дапамогі ў выкананні правоў сваіх грамадзян.

ЕС гатовы аднавіць свае стасункі з Рэспублікай Беларусь і яе народам, як толькі беларускі ўрад прадэманструе павагу да дэмакратычных каштоўнасцяў і асноўных правоў народа Беларусі.

# «Басовішча» ў рэжыме эканоміі

Арганізатары ашчаджалі на ўсім. Затое гледачы папрыязджалі на BMW. Рэпартаж **Сямёна Печанка** з Басовішча–2009.


Алесь Пілецкі

Гваздом Басовішча-XX быў выступ N.R.M. у выглядзе «Мроі».

Гарадок сустрэў натоўпамі маладых і не вельмі людзей з намётамі і заплечнікамі. Большасць была апранутая ў саколкі з сімволікай Басовішча за розныя гады. Сапраўдную канкурэнцыю ім складуць потым навюткія саколкі з лагатыпам «Радыё Рацыя», якія разам з сувенірнымі торбамі будуць бясплатна раздаваць на фэсце.

Першы дзень быў насычаны алкаголем, і да канца праграмы дацягнулі далёка не ўсе. Перасоўванні па неасветленай тэрыторыі ўскладнялася праз хаатычна параскіданыя целы «стомленых» гулякаў.

Перад пачаткам на сцэне адбылася невялікая ракіроўка — замест «Жнюв» выйшла «Унія». Пасля ўрачыстага палівання са сцэны першых шэрагаў гледачоў шампанскім зайграў «Рахіс». Выступалі ў той вечар і беластоцкія «Rima» з «Zero-85».

Першы фестывальны дзень зацягнуўся да раніцы наступнага. Начаваць у намётавым мястэчку досыць няпроста: калі побач нехта не хроп, то абавязкова піў гарэлку і гучна абмяркоўваў з сябрамі надзённыя пытанні. І, вядома, без перапынку наладжваліся беларуска-польскія сувязі: «А ты пераспаў з той полькай? Не? А чаго ж ты сюды прыпёрся?», «А як па-беларуску «шкарпэткі?»

Другі дзень абяцаў вяртанне ў мінулае — на сцэне мусілі прагучаць песні пачынальнікаў «Басовішча». Такую місію на сябе ўзялі «Палац», для якога гэта быў семнаццаты фестываль, «Крама» на час ператварылася ў «Бонду», N.R.M. — у «Мрою». «Дыназаўры» не схібілі. Варта было бачыць сцішаныя твары маладзейшых за сам фэст удзельнікаў, калі ў зялёным святле за клавішамі з'явіўся Лявон Вольскі. Але ўжо «Краіну крывавых дажджоў» спявалі ўсім натоўпам. Не падвялі і «Уліс» з «Нейра Дзюбелем».

Польскія зоркі «Lao Che» ўзнялі хмары пылу перад сцэнай, такія былі танцы.

А «разагравалі» «старэчаў» «Босае сонца» і «Дзецідзяцей». Пэўнай нечаканасцю для сталай публікі былі апошнія, з беларускамоўнай праграмай. Шчыльнае гучанне, моцны вакал, вар'яцкія скокі па сцэне — Ганна Хітрык перадала магутнае прывітанне Вераніцы Кругловай часоў ранейшых «Крыві».

Крызіс ударыў і па Басовішчы. Па словах адной з арганізатарак фэсту, Касі Кузьміч, многія спонсары ў апошні момант адмовіліся дапамагаць, таму давялося клапаціцца пра самае пільнае. Сёлета не было экранаў на сцэне, дый сцэна была адна, паменшала аховы. Чуліся нараканні на якасць гуку.

Адной з істотных праблемаў стала візавае пытанне — польскае консульства ў Гродне, якое адзінае сёлета выдавала візы, задаволіла толькі 600 заявак з 1060. І ўсё адно разам з польскімі суродзічамі беларусы на фэсце складалі большасць.

Кажучы пра інцыдэнты ў часе фэсту, Кася Кузьміч падкрэсліла, што сюды прыязджаюць самыя розныя людзі — нехта паслухаць музыку, пазнаёміцца з новымі людзьмі, а нехта паскандаліць ці скрасці тэлефон. «Але тут да беларусаў пытанняў у аховы няма», — запэўніла яна. На фэсце здарыўся непрыемны выпадак — некалькі мясцовых моцна збілі маладафронтаўца Ігара Шчакарэвіча.

Гэтым разам было меней і нацыянальных сцягоў — менш за дзесятак. Не было і польскіх і чэшскіх, якія стала прысутнічалі на ранейшых фестывалях.

Затое забіралі ўвагу аўто вакол фестывальнага гарадка — навюткія BMW з мінскімі нумарамі.

Па словах старажылаў фэсту, раней людзі траплялі сюды больш цягнікамі ды аўтобусамі, цяпер жа аўто з беларускімі нумарамі робіцца ўсё болей.

Вядоўца фэсту Віктар Шалкевіч на гэтыя дні быў запрошаны на два вяселлі і на З'езд беларусаў свету. «Некалі на Басовішчы музыкі гралі за ідэю, яны не былі такія сквапныя, як цяпер. Гэта былі сустрэчы беларускамоўных людзей па абодва бакі мяжы», — прыгадаў ён. Цяпер жа так і чуеш пасля беларускамоўных спеваў: «Микрофон поправьте, пожалуйста!» Віктар выглядаў трохі расчараваным: «Мы хацелі заправіць сёлета на сцэну ўсіх тых, хто быў тут 20 гадоў таму, але не атрымалася». Ён кажа, што наступны фэст будзе кардынальна новым. Па словах музыкі, многім сённяшнім гуртам не хапае інтэлектуальнага складніку: «Граць, здаецца, умеюць, а слухаць часам дык і няма чаго».

Подых крызісу адчулі многія ўдзельнікі юбілейнага Басовішча. Але многіх гэтыя выпрабаванні не засмуцілі. Ігар з Гродна, які не прапускае фэсту ад 2002 году, выглядаў задаволеным: «Ужо сумую і чакаю наступнага году». З ім цяжка не пагадзіцца — неперадавальнай атмасферы фестывалю ў Гарадку, здаецца, не здольны нашкодзіць ніякі крызіс.

**Сямён Печанко, Гарадок—Мінск**

## ДЫСКАГРАФІЯ

### Ірына Відава




IV, ТДА «Гриол», 2009

Фота спявачкі на вокладцы ў скураных садамазаапранахах.

Альбом са шматабяцальнай назвай (такая ж у чацвертай кружэлкі Led Zeppelin) пры павярховым знаёмстве апынуўся бляклай ксеракопіяй другаснай расійскай папсы нават не з шэрагу Сенчуковай і Салтыковай. Ёсць такое тэлешоў-здзек — «Мобильные блондинки». Дык там дзяўчаты пяюць тую ж луху, што і нашая(?) спявачка, але ў аранжыроўкі іх рэальна ўкладаюцца людзі — грашыма, часам, а мо нават і мазгамі. Відавочна, што ў гэты альбом замала ўклаліся і тым, і другім, і трэцім. А фота спявачкі на вокладцы ў скураных садамазаапранахах робіць сваю справу да канца — хочацца найхутчэй забыцца на тое, што ты бачыў (чуў). Бянтэжыць прыналежнасць да гэтага правінцыйнага цырку паважанага чалавека — аўтара адной з самых выдатных беларускіх песняў — «Малітвы» на словы Купалы, якую пяяў Мулявін. У рэкламе дыску на поўным сур'ёзе вядзецца, што «вядомы кампазітар Алег Молчан выступіў у ролі не толькі аранжыроўшчыка, але і саўндпрадусара, а ўсе песні, якія дагэтуль былі ў ратацыі, былі пераараанжыраваныя і перазапісаныя адмыслова да выхаду дыску для надання альбому цэльнасці». Страшна падумаць, якія гэтыя песні былі раней.

Трэк з прэтэнзіяй — «Тают чувства». Чаму б не зрабіць інтэлектуальны альбом лёгенькай музыкі ну хоць бы пад «Квартал»?

### Atlantica




Taboo, West Records, 2009

Густ і стыль навідавоку.

Праект вярнуўся пасля двухгадовага перапынку ў найлепшым выглядзе. Atlantica адмовілася ад малаўцямных спробаў зрабіць беларускі «модэрн токінг» у выглядзе дуэту старэючых хлопчыкаў ці змяшанае поп-трыа. І ў выніку іх матэрыял стаў слухабельным. Цяпер калі і прыцягваць за вушы якія аналагі, дык толькі Depeche Mode часоў «Music For The Masses» — асабліва цень Гэхана легла на «Change», «Princess Sweet» і «It's Not About Us». Апошнюю дык наогул можна назваць песняю песняў айчыннага сынтыпопу, яна гарманічна можа гучаць у эфіры хоць якой эфэмкі свету. Рэдкая з'ява: падчас праслухоўвання дыску з катэгорыі «беларуская папулярная музыка» адчуваеш гонар: густ і стыль навідавоку. З асаблівых меладычных прыгажосцяў — загалоўная песня (вакал ды фартэпіяна) і «Ave Maria» акапэла (арыгінальная версія таксама цуд). Atlantica запісала выдатны альбом. Калі гэты матэрыял гучыць нагэтулькі ж трапна ўжывую — то нізкі паклон.

# Вядзьмарскія працэсы ў ВКЛ

**Закон, які дазваляў спаліць чалавека на вогнішчы за вядзьмарства, быў скасаваны на беларускіх землях толькі ў канцы XVIII ст. Піша Віталь Быль.**

Напярэдадні Вялікадня 1643 году над прадмесцямі Полацку вецер гнаў пасмы цёмна-шэрага дыму. Пабожныя мяшчане, гледзячы на іх, жагналіся: сёння на полі за горадам палілі цела чараўніка Васіля Брыкуна. Суд над ім цягнуўся амаль месяц і ўзрушыў люд паспаліты. Дасціпны адвакат спрытна разбіваў доказы абвінавацаў і сведкаў, кат не мог дабіцца ні слова ад падсуднага. Але шкодніцкае чарадзейства было выкрытае. Вырак суровы: катаванні і вогнішча. Людзі перадавалі адзін аднаму: чарадзей той на сябе рукі наклаў у турме, сам сабе горла перарэзаў, пайшоў да свайго гаспадара — д'ябла...

Расправы з чараўнікамі ў Вялікім Княстве Літоўскім не былі такой пашыранай з'явай, як у Заходняй Еўропе. Але паляванне на вядзьмарак не абышло і нашых земляў. У судовых кнігах, у летапісах і мемуарах, у народнай памяці занатаваныя сведчанні той неспакойнай эпохі.

ВКЛ апынулася на мяжы праваслаўнага і каталіцкага светаў. Праваслаўе, што ў сваім народным варыянце ўвабрала багата паганскіх элементаў, вызначала духоўны свет тутэйшага люду, у той час як каталіцтва ўсё больш уплывала на пісьмовую і арыстакратычную культуру. Разам з каталіцтвам прыходзяць лаціна, рымскае, гарадское і каталіцкае кананічнае права, а таксама дэманалагічныя ўяўленні. У 1436 г. у ВКЛ пачаў дзейнічаць трыбунал Святой інквізыцыі. Праўда, шырока інквізіцыя тут не разгарнулася. Нават у Кароне Польскай суд быў у руках не так айцоў-інквізітараў, як мясцовых царкоўных феадалаў. Але, калі верыць Міколу Гусоўскаму, тыя дзейнічалі з сапраўдным інквізітарскім энтузіязмам. У «Песні пра зубра» ён піша, што ведзьмакоў

…катуюць люта,
Перш чым спаліць ці ўтапіць, як і тых вінаватых,
Хто з імі знаўся і ведаў аб чарах вядзьмацкіх,
Ды не данёс у царкву на нячысцікаў грэшных.
Хопіць таго, каб прайшлі, пракаціліся дзейкі:
Там той вядзьмачыць
ці знаецца з д'ябальскай сілай —
Зараз жа суд і расправа…

Іншая сітуацыя была на ўсходзе Беларусі, куды не дайшлі яшчэ інквізіцыйныя нормы і дзе былі моцныя мясцовыя прававыя традыцыі. Пра гэта сведчыць віцебская справа 1534 г., калі выкрытая вядзьмарка была пакараная толькі выгнаннем з гораду.

### Перадавы еўрапейскі досвед

Сапраўднае ж паляванне на вядзьмарак пачынаецца толькі тады, калі дзяржава бярэ гэтую справу ў свае рукі. У III Статуце ВКЛ шкоднае чараўніцтва стаіць у адным шэрагу з разбоем, згвалтаваннем, падпалам ды іншымі цяжкімі злачынствамі і караецца «горлам» — смерцю.

Але падрабязнасцяў падобных справаў заканатворцы ВКЛ не дапрацавалі. І тут на дапамогу разгубленым барацьбітам са злом прыходзіў перадавы еўрапейскі досвед. Суддзі і следчыя шукалі адказы на пытанні ў артыкулах магдэбургскага і цэсарскага (рымскага) права, неацэнную дапамогу прыносіў несмяротны опус нямецкіх інквізітараў-практыкаў Шпрэнгера і Інсторыса «Молат ведзьмаў», які быў перакладзены ў 1614 г. на даступную польскую мову.

За пяро ўзяліся і аўтары з Рэчы Паспалітай. «Правіннасць права чартоўскага супраць роду чалавечага», «Чараўніца абвінавачаная, альбо Кароткая навука і перасцярога з боку чараўніц», «Перасцярогі духоўныя суддзям, інвестыгатарам і інстыгатарам» — няпоўны пералік працаў, што выходзілі з друкарскіх варштатаў.

З пачатку XVII ст. паспаліты люд таксама пачынае падазрона азірацца навокал. Нехта ноччу абліў вадой сцяну хаты, у бочцы з вадой з'явіўся пук валасоў — і мешчанін бяжыць са скаргай на чары ў найбліжэйшы суд. Нават прусакі, як сведчаць судовыя запісы, маглі падацца якому палахліваму ліцвіну магічнай зброяй зламыснікаў. А калі сям'ю ды гаспадарку апанавалі няўдачы — дык гэта несумненна справа рук ведзьмака.

### Чараваць можна, рабіць шкоду — не

Адначасова людзі шырока карысталіся паслугамі чараўнікоў. Найбольш папулярнай была варажба. Сяляне, мяшчане, нават шляхта аб чым толькі не варажылі: аб ураджаі, прыплодзе жывёлы, аб уласным здароўі, часе смерці. Ну і, канечне, ва ўсе часы дзяўчаты і кабеты ўсіх станаў запытвалі таемныя сілы аб замужжы, каханні, дзецях і г.д.

Кожны дарослы, не абавязкова варажбіт, ведаў замовы на розныя выпадкі жыцця і звязаныя з імі рытуалы. Усё гэта не разглядалася як злачынства, але магло выклікаць падазрэнне. А калі, крый Божа, падазрэнні дойдуць да суду, то паны-суддзі у самай бяскрыўднай замове знойдуць д'ябальшчыну.

### Распуста і вядзьмарства

«Распусце вядзьмарства, аднак, часцей аддаюцца жанчыны», — зазначае Мікола Гусоўскі, абазнаны ў ведаўскіх тэорыях лацінскага свету. Так, і ў Вялікім Княстве жанчыны лічыліся больш здольнымі да пэўных відаў магіі. Тагачасныя знаўцы адрознівалі вядзьмарак і чараўніц: чараўніца можа шкодзіць, а можа дапамагаць людзям, ведзьма ж знаходзіцца ў шчыльных стасунках з нячыстай сілай.

Часта з чарадзействам звязвалі прадстаўніц «найстаражытнейшай прафесіі» — блудніцаў. У пэўнай меры гэта звязана з сярэднявечнымі ўяўленнямі пра іх сэксуальныя зносіны з д'яблам. Царква вучыла паству, што блудніца — інструмент і памагатая Сатаны. Таму не дзіўна, што на іх даносілі родзічы кліентаў: а як жа яшчэ патлумачыць, чаму ненаглядны сыночак ці верны муж раптам кінуўся ў абдымкі распусты. Канечне, вінаватыя чары!

### Вядзьмак — гэта сямейнае

Але самымі моцнымі чарадзеямі ў ВКЛ лічыліся мужчыны. З магіяй атаясамлівалі прадстаўнікоў пэўных несельскагаспадарчых прафесій, звязаных з касмічнымі стыхіямі: агнём, вадой, зямлёй (глінай) і паветрам: пчаляроў, кавалёў, млынароў, нават цесляроў. Таксама чараўнікамі лічылі музыкаў, найперш дудароў.

З народнай традыцыі і судовых справаў вядома, што чараўнікі адрозніваліся па сваёй моцы, былі «старэйшыя» і «малодшыя». Існавалі нават цэлыя чараўніцкія кланы, дзе таемныя веды перадаваліся з пакалення ў пакаленне найбольш здольным нашчадкам ці даверанным вучням. Так, калі ў Браславе ў 1615 г. судзілі чараўніка Тумеля Дарадундэнаса, суседзі даводзілі суддзям, што яго сям'я і сваякі здаўна займаюцца чарадзействамі, а з яго продкаў аж трыццаць душ за гэта трапіла на вогнішча. Урэшце ўслед за продкамі выправіўся і сам Тумель: быў спалены, як тады казалі, «на стосе».

### Сам працэс

Калі ведзьмака хапалі «за руку» на месцы злачынства, то судзілі без доўгіх цырымоній, усёй грамадой ды па старажытных звычаях — так званым копным судом. Абвінавачаны мог адмаўляцца: маўляў, чараў ніякіх не ведаю, а карова ў суседа сама здохла, мо з'ела штосьці не тое. Тады працэс ускладняўся, даводзілася выклікаць спецыяліста па перакананні — тутэйшага ката-«містра». А калі ўжо і ён не даваў рады або справа была занадта складаная, адсылалі ў паявтовы гродскі суд — хай начальства разбіраецца.



Судовы працэс пачынаўся са скаргі, якую падаваў пацярпелы. У першай палове XVII ст. скаргі ахвяраў чараўніцтва найчасцей проста занатоўвалі ў судовыя кнігі і пакідалі без належнага разгляду — відаць, паны пісары толькі пасміхаліся ў вусы з забабонаў простага люду. Але іх наступнікі да падобных з'яваў ставіліся куды больш адказна.

Абвінавачанаму суд задаваў пытанні (т.зв. interrogatoria), прычым адказы на іх вымагаў нават сілай. Допыт быў вусны (libera executio) і цялесны (corporalis executio). Следчых цікавілі наступныя пытанні: як навучыўся чараваць, ад каго і як даўно? Калі і як чараваў? Якіх чараўнікоў ведаеш? Дзе твая Лысая гара для шабашаў? Пасля допыту адбываліся катаванні, якія па законе можна было паўтараць тры разы. Часам «нізкапаклонства перад Захадам» — механічнае капіяванне інквізіцыйных прыёмаў — прыводзіла да таго, што катаванні ўчыняліся без усялякай патрэбы, нават калі віна была даказаная і ўсе неабходныя звесткі атрыманыя. Напрыклад, так было ў згаданай гучнай полацкай справе Васіля Брыкуна.

Пасля допыту адбывалася апытанне сведкаў: ці не згадаюць яны якіх падазроных паводзін, словаў, пагроз. «Пахвалкі»-праклёны самі па сабе выступалі як наўмысна шкодныя дзеянні, бо словы ў вуснах чараўніка мела вялікую сілу. Да следства падключалі і ўскосных сведкаў, якія самі не мелі ад чараўніка шкоды, але чулі аб розных здарэннях. І сведкі сведчылі... Сведчылі пра Максіма Знака з-пад Гародні, што, адняўшы розум, прымусіў ахвяр ламаць печы і грызці камяні. Сведчылі пра палачаніна Брыкуна, у якога лёталі дровы, а нахабнік, што палез да ягонай жонкі, раптоўна быў вымушаны абдымацца з гарачым комінам...

### Невінаватыя патоне

Часам для высвятлення віны выкарыстоўвалі такую папулярную ў Еўропе «экспертызу», як выпрабаванне вадой. Лічылася, што чыстая вада не прыме чараўніка. Так, падчас згаданай браслаўскай справы 1615 года трох падазраваных, звязаўшы, кідалі ў ваду, але ў тых ну ніяк не выходзіла патануць. Тады быў праведзены «следчы эксперымент»: укінуты ў ваду крыштальна сумленны чалавек адразу пайшоў на дно, ажно ледзьве яго ўратавалі. Такім чынам узрушанаму народу стала абсалютна відавочная віна падсудных.

Як у любым расследаванні, вырашальную ролю мелі рэчавыя доказы. Падчас абшуквання следчыя шукалі нешта незвычайнае, што, на іх думку, магло быць звязана з чарамі. Шукалі — і знаходзілі: мяшэчак з канапляным зернем, скрутак з пяском і перцам ды іншыя «жахлівыя» прадметы.

Прысудам было, як правіла, спаленне на вогнішчы. Агню ў народнай свядомасці прыпісвалася ачышчальнае дзеянне. Пры гэтым пакаранне магло суправаджацца пэўнымі рытуальнымі дзеяннямі, напрыклад, часам чараўніка палілі прывязаным да драбінаў: па драбінах абцяжараная грахамі душа можа хутчэй трапіць на той свет.

### Спаліць мог нават аканом

Пераследам чараўнікоў ча-

**Віталь Быль**

нар 1989. Студэнт гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Жыве ў Мінску.

сам займаліся і вотчынныя суды, дзе судаводства ажыццяўляў сам пан-уладальнік ці службовыя асобы яго дваровай адміністрацыі. Антычараўніцкая дзейнасць такога суду залежала ад поглядаў і энтузіязму «паляўнічага».

Напрыклад, у чэрвені 1758 г. аканом аднаго з маёнткаў графа Тышкевіча паведамляе гаспадару, што спаліў шэсць чараўніц і поўны рашучасці працягваць гэтую справу. Прычым іх ён выявіў правераным народным спосабам: калі на святой вадзе з сямі цэркваў варыць кісель, то ведзьмы не ўтрымаюцца і прыйдуць яго прасіць. Там жа згадваецца яшчэ адзін службовец, які спаліў двух чараўнікоў — мужчыну і жанчыну.

### Цёмныя сяляне і цёмныя магнаты

Не варта лічыць, што ў чары верылі толькі цёмныя сяляне. Арыстакратыя, палітыкі і палкаводцы звярталіся для вырашэння сваіх задач па дапамогу таемных сіл. Пры каралеўскім двары і дварах важных магнатаў знаходзілі сабе месца алхімікі і астролагі. Злыя языкі шапталіся, што раман Жыгімонта Аўгуста з Барбарай Радзівіл — плён любоўнага зелля. (Як не ўспомніць, што, па легендзе, да чарнакніжнікаў звярнуўся і несуцешны кароль, каб выклікаць з таго свету прывід каханай.) Так ці не, але гэтыя падзеі паклалі пачатак казачнай магутнасці «некаранаваных каралёў» Радзівілаў. Таксама ашаламляльныя поспехі Багдана Хмяльніцкага яго праціўнікі прыпісвалі ўмяшанню д'ябальскіх сіл, выкліканых вядзьмаркай Салохай.

Магіяй паспрабаваў скарыстацца маскоўскі ваявода Хаванскі, які здабываў у 1660 г. замак Ляхавічы. Гэта была адна з найлепшых крэпасцяў Рэчы Паспалітай. Маскоўцам так была трэба гэтая перамога, што ваявода звярнуўся па дапамогу да мясцовага ведзьмака. І той паабяцаў зачараваць гарматы фартэцыі. Але ці то вядзьмак выявіўся патрыётам і здзейсніў акт сабатажу, ці то чарадзей ён быў нікуды не варты, але абаронцы шчасліва адбілі ўсе атакі. А падаспелыя палкі Чарнецкага і Сапегі неўзабаве ўшчэнт разграмілі няўдачлівага ваяводу.

XVIII стагоддзе прынесла Еўропе дамінаванне веры ў розум, рацыяналізму мыслення, навуковага погляду на свет. З сярэдзіны стагоддзя гэтыя ідэі сталі набіраць сілу і ў Рэчы Паспалітай. Вялікі розгалас атрымаў працэс, які адбыўся у 1775 г. у вёсцы Дарухова на сілезскай мяжы, калі было спалена чатырнаццаць жанчын. Пад уплывам гэтых падзей на сойме 1776 году кароль Станіслаў Аўгуст прапанаваў скасаваць катаванні, а кашталян бецкі Войцах Клюшэўскі — смяротнае пакаранне за чараўніцтва. Сойм гэта адзінадушна ўхваліў. Такім чынам быў пакладзены канец больш чым дзвюхсотгадоваму санкцыянаванаму дзяржавай «паляванню на вядзьмарак».

# 25 гадоў без Караткевіча



25 ліпеня спаўняецца чвэрць стагоддзя, як памёр Уладзімір Караткевіч. Пісьменніку было тады толькі 53. Як па-іншаму магла б пайсці беларуская гісторыя 90-х, калі б быў жывы яго бурлівы талент!

Пахаванне Уладзіміра Сямёнавіча стала першай значнай спантаннай патрыятычнай акцыяй у пасляваеннай Беларусі. Успамінае сябар пісьменніка Адам Мальдзіс:

— 26 ліпеня 1984 году я зрабіў запіс: «Учора ў чатыры гадзіны раніцы памёр Валодзя. Страта, якую не пакрые ніхто ніколі. Толькі пасля смерці надаецца яму належнае...». Яго пахаванне прайшло, як мне здавалася, спакойна. Ніякага супраціву з боку ўладаў не было. Прыйшло шмат людзей, менш, праўда, чым пазней прыйдзе на развітанне з Быкавым. Але гэта ўжо будуць іншыя маштабы свядомасці. Людзі, якія прыйшлі да Караткевіча, былі кансалідаваныя. Гэта было першае настолькі шматлюдная пахаванне. Ішлі не ад таго, што была разнарадка. Усе ішлі самі. Прыязджалі нават з дальніх гарадоў Беларусі.

Дарэчы, да 80-годдзя з дня нараджэння пісьменніка помнік яму можа паўстаць ва Украіне.

**Сяргей Макарэвіч**

**У Мінску паставяць помнікі Быкаву, Караткевічу ды Усяславу Чарадзею**

Прынамсі, гэта перадугледжвае праект Зводнага плану ўстаноўкі мемарыяльных збудаванняў у Рэспубліцы Беларусь на 2009—2012 гады. Пра гэта паведаміла галоўны спецыяліст Упраўлення мастацтваў Міністэрства культуры Людміла Назарава.

Стаяць у планах і Дунін-Марцінкевіч з Мулявіным, і князь Глеб Усяславіч.

У Віцебску маюць паставіць знак у гонар 600-годдзя Грунвальду. У Гродне — помнікі Францішку Багушэвічу, аўтару пераломных словаў «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі...» і першаму нашаму каралю Міндоўгу.

**БелаПАН**



# Памёр Лешак Калакоўскі

Самы вядомы польскі філосаф, адзін са светлых розумаў Цэнтральнай Еўропы, адышоў з гэтага свету на 82-м годзе жыцця ў клініцы Оксфарду.

Калакоўскі быў спецыялістам па марксізме. У юнацтве ён быў марксістам сам. Пад 1968 год філосаф перайшоў на рэзка крытычныя да камунізму пазіцыі і ўрэшце эміграваў з Польшчы ў Брытанію, пасля таго як яго звольнілі з пасады прафесара Варшаўскага ўніверсітэту за падтрымку антыкамуністычнай апазіцыі.

Калакоўскі прыйшоў да думкі, што таталітарызм Сталіна быў лагічным завяршэннем інтэлектуальных пабудоваў Карла Маркса.

На эміграцыі ён стане прафесарам Оксфардскага універсітэту. Мараліст, гісторык філасофіі, ён займаўся найбольш складанымі дылемамі еўрапейскае культуры.

Светлая памяць яму ад імя беларусаў, якіх ён ведаў і якім з усёй сваёй дабрынёй спачуваў.

**Мікола Бугай**

# Вазьміце ў рукі Вальтара

Міхась Казлоўскі выдаў том твораў малавядомага, але вартага пісьменніка з беларускай Латгаліі.

Не ўся беларуская культура ствараецца ў Мінску. Намаганнямі маладзечанскага краязнаўцы Міхася Казлоўскага ў выдавецтве «Кнігазбор» выйшла кніга беларускага літаратара першай паловы XX стагоддзя, які жыў у Латгаліі — колісь беларускім краі, які цяпер належыць Латвіі. Звалі яго Віктар Вальтар.

У кнігу ўвайшлі ўсе знойдзеныя дагэтуль празаічныя і паэтычныя творы гэтага таленавітага, але пакуль мала вядомага ў Беларусі творцы. Шкада толькі, што наклад выдання складае ўсяго 300 асобнікаў.

Адметна, што працаваў над кнігай чалавек, які займаецца беларускімі даследаваннямі аўтаномна ад сталічных асяродкаў.

Міхась Казлоўскі штогод ладзіць канферэнцыі, прысвечаныя той ці іншай постаці культуры, з пачатку 2000-х гадоў выпускае якасны шматстаронкавы краязнаўчы часопіс «Куфэрак Віленшчыны», а таксама кніжную серыю. Кніжка Вальтара стала ўжо 13-м (!) выданнем у Бібліятэчцы «Куфэрка».

Сярод ранейшых куфэркаўскіх бэстсэлераў — том пра дзеяча міжваеннага часу Адольфа Клімовіча.

Працуе маладзечанскі краязнаўца амаль самотна, абапіраючыся на дапамогу толькі невялічкага кола сяброў.

**Сяргей Богдан**

### Добра там, дзе нас няма

Чарговы «Гары Потэр» сабраў $396,7 млн.

«Гары Потэр і прынц-паўкроўка» стаў лідэрам кінапракату ЗША і сабраў пад канец суботы $159,7 млн.

З серады гэты фільм зарабіў $237 млн у іншых краінах і давёў прыбытак кінакампаніі Warner Bros., якая выпусціла гэтую карціну, да $396,7 млн.

На другім месцы кінапракату ЗША — «Ледавіковы перыяд-3» з $17,7 млн, на трэцім — «Трансформеры: помста зрынутых» з $13,8 млн.

Вось такія абароты. А нашыя творцы часам пакутліва збіраюць па сотні даляраў на выданне свайго дыску.

**НБ**

### «Не выдумляй лішняга, Барыс»




17 ліпеня быў 50-гадовы юбілей у рэдактара незалежнага літаратурнага часопіса «Дзеяслоў» Барыса Пятровіча. «Ты сапраўды ў сваім часе такі адзінокі, сапраўды пачуваешся такім самотным?.. — пытае Барыса Пятровіча адна з гераіняў ягонай кнігі «Жыць не страшна», і ён, аўтар, які прыдумаў і гэтую кнігу, і гэтую гераіню, адказвае ёй, што так, ён бязмежна адзінокі, адзінокі нават сярод сяброў на сваім дні нараджэння. «І хоць не маю я ніякай падставы не давяраць ягоным адчуванням, рэфлексіям, словам, тым не менш мушу сказаць тое, чаго не сказала яму ягоная гераіня: ты ўсё ж — пры ўсіх сваіх фантазіях — не выдумляй лішняга, Барыс», — так павіншаваў свайго калегу з народзінамі Уладзімір Някляеў.

Рэдакцыя НН далучаецца да віншаванняў.

# Найлепшыя хіты Майкла Джэксана

Джаз-клуб Яўгенія Уладзімірава запрашае ўсіх прыхільнікаў Майкла Джэксана **26 ліпеня ў 18.00 і 21.00 у Джаз-клуб (Палац Рэспублікі)** на вечар памяці караля поп-музыкі.



## КАНЦЭРТЫ

**Сустрэчы з Андрэем Мельнікавым**

Шэраг канцэртаў-сустрэч Андрэй Мельнікаў дасць на Гомельшчыне. Першы канцэрт адбудзецца **25 ліпеня ў гомельскай бібліятэцы № 3 і распачнецца а 12-й**. Наступны плануецца **ў той самы дзень па адрасе: вул.Палеская, 52**. **Пачатак а 15-й.** Уваход вольны. Таксама сустрэча з Андрэем Мельнікавым пройдзе **ў намётавым мястэчку ля вёскі Раманавічы Гомельскага раёну 28 ліпеня**. **Пачатак у 19.40.**

**Камоцкі ў Музычным завулку**

Творчая сустрэча з Алесем Камоцкім адбудзецца **30 ліпеня ў мінскім Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры (зав.Музычны, 5)**. **Пачатак а 17-й.**

**Парыжскія вулкі**

**22 ліпеня а 22-й у Палацы Рэспублікі** пройдзе канцэрт **Жана-Лу Ланьёна** (Францыя, труба) і **«Jazz-quartet»** Аляксея Чарамізава (Расія) з праграмай «Парыжскія вулкі».

**Madera Hard Blues**

**23 ліпеня ў «Графіці» (зав. Калініна, 16)** — канцэрт Madera Hard Blues. **Пачатак а 19-й.**

## ІМПРЭЗЫ

**Фестываль мастацтваў «ДАХ-9»**

Міжнародны фестываль мастацтваў «ДАХ-9» пройдзе **з 25 жніўня да 20 верасня ў Палацы мастацтваў (Казлова, 3)**. На адной пляцоўцы будуць суіснаваць жывапіс і скульптура, фатаграфія і перформанс, літаратура і музыка, тэатральнае мастацтва і кіно, стрыт- і відэа-арт. У межах фестывалю будуць прадстаўленыя персанальныя і супольныя праекты беларускіх аўтараў, а таксама работы іх калегаў з Германіі, Нарвегіі, Італіі, Польшчы, Украіны, Расіі, Нідэрландаў, Японіі, ЗША і Ізраілю.

**Тэатр «ІнЖэст» на фэсце «ДАХ-9»**

**26 і 27 жніўня ў Палацы мастацтваў** — пластычны тэатр «ІнЖэст», этна-рокавы гурт «Плато» і Сяргей Пукст у перформансе «Х-Традыцыцыя». **Пачатак а 21-й.**

## ВЫСТАВЫ

**Філасофія каменю**

**У галерэі «АртБлік» (Някрасава, 11-34) да 31 ліпеня** працуе выстава твораў майстра-ювеліра Вольгі Гараевай «Філасофія каменю», на якой можна ўбачыць непаўторныя ювелірныя ўпрыгожанні.

**Бітва за Беларусь: верасень 1943 — ліпень 1944**

**У музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны да 31 кастрычніка** працуе выстава «Бітва за Беларусь: верасень 1943 — ліпень 1944», прымеркаваная да 65-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У аснове выставы — калекцыя лістоў палявой пошты.

**Зімовыя сюжэты**

**У гарадской мастацкай галерэі твораў Л.Шчамялёва (пр.Ракасоўскага, 49) да 30 ліпеня** працуе выстава акварэлі Уладзіміра Гервакера «Зімовыя сюжэты». Акварэлі Уладзіміра Гервакера вельмі стрыманыя, лаканічныя ў каляровых, кампазіцыйных і танальных рашэннях, тэхнічных прыёмах, што адпавядае «зімоваму» філасофскаму настрою.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Штогадовая акцыя памяці паўстанцаў 1863 г. на Лідчыне

Кожны год улетку Лідская гарадская арганізацыя ТБМ праводзіць акцыю памяці паўстанцаў 1863—1864 г.

15 год запар ва ўрочышчы Крыжы, што знаходзіцца каля вёскі Малое Ольжава, збіраюцца людзі, каб ушанаваць памяць тых, хто змагаўся за нашую свабоду.

У гэтым годзе акцыя будзе праводзіцца 26 ліпеня. Дабрацца да месца можна на дызелі, які адпраўляецца з Ліды ў 12.10, да станцыі Белагруда, а далей пешшу ва ўрочышча Крыжы.

Альбо сустрэцца з арганізатарамі ў 11.55 каля помніка «130 год беларускай чыгунцы» на чыгуначным вакзале ў Лідзе. І дабрацца туды з тымі, хто дакладна ведае месца правядзення і можа распавесці гісторыю помніка каліноўцам і гісторыю Лідчыны.

**НШ**

## ТЭАТРЫ

**23 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр (малая сцэна)** — «Хам»

**24 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Хам»

**25 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Вячэра з дурнем»

**Купалаўскі тэатр (малая сцэна)** — «Варшаўская мелодыя»

**27 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Вячэра з дурнем»

**Купалаўскі тэатр (малая сцэна)** — «Дамскае танга»

**28 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»

**29 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»

**30 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»

**Купалаўскі тэатр (малая сцэна)** — «Адчыніце кантралёру!»

**31 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»

## ТЭАТРЫ




# Гары Потэр у шэрых барвах

**Гары Потэр і прынц-паўкроўка** (Harry Potter and the Half-Blood Prince)

Вялікабрытанія — ЗША, 2009, каляровы, 153 хв.

**Рэжысёр:** Дэйвід Етс

**Ролі выконваюць:** Дэніэл Рэдкліф, Эма Уотсан, Рупэрт Грын, Майкл Гэмбан, Алан Рыкман, Джым Бродбэнт, Хелена Бонэм-Картэр

**Жанр:** казачныя прыгоды паводле аднайменнай кнігі Джаан Роўлінг

**Адзнака:** 6 (з 10)

Гары Потэру, які працягвае навучанне ў чароўнай школе, трапляе ў рукі загадкавая кніга прынца-паўкроўкі. Разам з сябрамі і дырэктарам Дамблдорам ён спрабуе раскрыць сакрэты злога чараўніка Волана дэ Морта.

Шостая серыя Патэрыяны пастаўленая рэжысёрам Дэйвідам Етсам у попельна-шэрых барвах. Кожная новая кніга Джаан Роўлінг рабілася ўсё змрочнейшай — і экранізацыя адлюстроўвае змену атмасферы. Зло рвецца на вуліцы Лондану, людзі звяканыя, над школай завісаюць цёмныя хмары-знакі.

Многія сцэны — з праклёнамі і падводнымі мерцвякамі — нагадваюць хорары, так што стужка мае ўзроставыя абмежаванні — дзецям прагляд толькі з дарослымі. Але галоўныя бойкі разгортваюцца ў сэрцах герояў, прыходзіць каханне — і знята гэта з выключнай цнатлівасцю, як і мае быць у казцы.

Герміёна ладзіць сцэны рэўнасці, Гары баіцца прызнацца ў любові да Джыні, а Рон стаецца ахвярай пацешна-навязлівай дзявулі й труціцца любоўнымі зёлкамі. Гэта звычайныя падлеткі — са сваімі радасцямі й праблемамі — у побытава-чароўных абставінах.

А за акном згушчаецца цемра, чарнільныя кроплі ўспамінаў — выдатная візуальная вынаходка! — ствараюць карціны жыцця з нянавісцю ў сэрцы, набліжаюцца цяжкія часы.

І толькі людская салідарнасць здольная разагнаць змрок.

Вас чакаюць новыя выпрабаванні — і прыгоды з «Дарамі Смерці».

**Андрэй Расінскі**

# Алег Латышонак: Галоўныя асобы беларускай гісторыі — Рысінскі і Паклонскі

Свет пабачыла новая кніга беластоцкага гісторыка Алега Латышонка «Нацыянальнасць — беларус».

Першыя прэзентацыі аўтар правёў у раённых цэнтрах на Гродзеншчыне. На З'ездзе беларусаў свету па продажах гэта была адна з найбольш папулярных кніг.




**Беларускі інтэлектуал — небяспечная прафесія**

У лютым Алег Латышонак прэзентаваў у Беларусі сваю кнігу «Жаўнеры БНР». Тады прафесар двойчы за адзін дзень трапіў у аўтамабільную аварыю. Прага сустрэцца з беларускімі чытачамі магла каштаваць навукоўцу жыцця. Разам з Валерам Булгакавым Латышонак ехаў з сустрэчы з Полацка на прэзентацыю ў Горадню. Спяшаліся. Праз галалёд машына паляцела пад адхон. На шчасце, ніхто не пацярпеў. Таму паехалі далей. У Мядзельскім раёне пры абгоне машыну, у якой ехаў гісторык, зноў занесла. Праз пашкоджанне аўтамабіля давялося вярнуцца ў Мінск. Але гэтае здарэнне не спыніла навукоўца. На гэтым тыдні ён правёў чатыры прэзентацыі новай кнігі «Нацыянальнасьць — беларус» на Гарадзеншчыне.

**«Наша Ніва»: Спадар Алег, пра што Вашая новая кніга?**

**Алег Латышонак:** У кнізе сабранае тое, што я раней пісаў пра даўнейшую гісторыю Беларусі. Фактычна гэта мая доктарская дысертацыя, прысвечаная пачаткам беларускай нацыянальнай ідэі, гісторыя ад русінаў да беларусаў.

**«НН»: Колькі Вы працавалі над гэтай кнігай?**

**АЛ:** Я пачаў збіраць матэрыялы недзе ў 1999 годзе, а скончыў у 2006. Калі пачынаў першы раздзел кніжкі, які расказвае пра стварэнне нацыі і фармаванне нацыянальнай ідэі, то думаў, што проста перапішу некалькіх сваіх калегаў адносна назвы «Белая Русь» і беларусаў і потым хутка перайду да мадэрнай гісторыі. Аднак аказалася, што не надта ёсць ад кога перапісаць. Праўда, праз нейкі час з'явілася праца Алеся Белага «Хроніка Белай Русі». Я ёй карыстаўся, але ўсё адно давялося правесці больш шырокае даследаванне вытокаў назвы «Беларусь».

**«НН»: А што адметнага, новага чакае чытача кнігі «Нацыянальнасць — беларус»?**

**АЛ:** Я б не сказаў, што мне ўдалося зрабіць нейкія адкрыцці. Хіба што я расстаўляю крышку інакш акцэнты нашай гісторыі. Выводжу на першыя ролі тых людзей, пра якіх раней гаварылася нямнога.

**«НН»: Каго Вы маеце на ўвазе?**

**АЛ:** Самай галоўнай асобай я лічу шляхціца Саламона Рысінскага — гэта першы чалавек, які назваў сябе беларусам, але ён вядомы толькі ў вузкім коле навукоўцаў і літаратуразнаўцаў. А другі — Канстанцін Паклонскі. Ён першым выступіў як палітык-беларусін. Ён пазіцыянаваў сябе менавіта як беларускі палкаводзец. Рабіў нешта на ўзор войска Запарожскага, толькі на Магілёўшчыне.

**«НН»: А адкуль такая цікавасць да гісторыі ўзнікнення назвы краіны і нацыі?**

**АЛ:** Мне гэта цікава і як гісторыку, і як грамадзяніну. Цікава, чаму я беларус, а не крывіч ці дрыгавіч. Між іншага, я прыйшоў да высновы, што ў XVII стагоддзі Беларусь была шматлюднай краінай, якая мела ўсе шанцы ператварыцца ў нацыю, калі б не Маскоўская вайна 1654—1667 гадоў. Я ў гэтым перакананы.

**«НН»: Апошнім часам з'яўляюцца нейкія групоўкі людзей, якія кажуць, што яны не беларусы, а ліцвіны ці крывічы. Як Вы да гэтага ставіцеся?**

**АЛ:** Проста сярод прадстаўнікоў нацыі заўсёды ёсць людзі, якім не падабаецца афіцыйная ідэалогія. У нас таксама шмат такіх, якія думаюць, што змяніўшы назву беларус на крывіч, нацыя стане мацнейшай. Фактычна ж гэта секты, якія маюць сваіх вернікаў, распрацаваныя ідэалогіі. Але яны вельмі памыляюцца, што простай зменай назвы можна вырашыць усе праблемы.

**«НН»: А над чым цяпер працуеце?**

**АЛ:** Над выданнем збору твораў. Гэта нялёгкая праца, трэба перачытаць усё напісанае. Думаю, што ў будучыні займуся даследаваннем беларуска-латышскіх дачыненняў.



Алег Латышонак падчас сустрэчы з чытачамі ў Мастах на Гарадзеншчыне.

**Алег Латышонак**

Нарадзіўся ў 1957 у Эльблёнгу (Польшча) у сям'і беларусаў. Ад 1965 сям'я жыве ў Беластоку, дзе Алег скончыў школу і ліцэй. У 1980 скончыў гістарычна-філасофскі факультэт Ягелонскага універсітэту ў Кракаве. Працаваў настаўнікам гісторыі. У 1982 арыштоўваўся за дзейнасць у руху «Салідарнасць». З 1997 — прафесар Беластоцкага універсітэту. Апошнія кнігі — «Жаўнеры БНР», «Нацыянальнасць — беларус».

Гэта мае наканаванне (смяецца). Мая жонка латышка, маё прозвішча таксама сведчыць пра наяўнасць латышскіх каранёў.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

ТЭЛЕПРАГРАМА НА 27 ЛІПЕНЯ — 2 ЖНІЎНЯ

## «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 27 ліпеня, панядзелак

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 11 серыя
**19.50** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**20.05** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**20.35** Госць «Белсату»: Стэфан Эрыксан — амбасадар Швецыі ў Рэспубліцы Беларусь
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Міндоўг» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** «Несвядомыя», маст. фільм, рэж. Хаакін Арыстрэль, 2004 г., Іспанія—Нямеччына—Партугалія—Італія.
**23.00** Аб'ектыў

### 28 ліпеня, аўторак

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19.05** «Ранча», серыял: 49 серыя
**19.55** Беларусы ў Польшчы
**20.15** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Гедымін» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.30** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 17 серыя
**22.25** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**23.00** Аб'ектыў

### 29 ліпеня, серада

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19.05** «Ранча», серыял: 50 серыя
**20.00** Хто ёсць кім: Алесь Лось
**20.20** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Вітаўт» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** «Асцярожна, бандыты!», маст. фільм рэж. Клод Лелюш, 1986 г. Францыя.
*Дэтэктыўная драма з элементамі камедыі. Традыцыйны французскі фільм. Сімон Верыні — 50-гадовы эксперт страхавога агенцтва — дасканала разбіраецца ў антыкварыяце і супрацоўнічае з бандаю, якая абкрадае дамы багатых. Аднойчы ад яго сыходзіць жонка, ён хавае сваю 11-гадовую дачку ў элітным пансіянаце ў Швейцарыі, а сам сядае за краты. Пасля адбыцця пакарання Сімон сустракаецца з дачкою; колішняя дзяўчынка ператварылася ў прывабную жанчыну, якая заручаецца з маладым яхтсмэнам з добрай сям'і. Дачка ўсё больш зближаецца з бацькам і неўзабаве трапляе на слізкую сцежку...*
**23.00** Аб'ектыў

### 30 ліпеня, чацвер

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19.05** «Ранча», серыял: 51 серыя
**20.00** YoLife! (моладзевая праграма)
**20.20** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Гедымін» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** «Саматра», дак. фільм, 2007 г., Беларусь
**21.50** Форум (ток-шоў): Без права на жыццё
**22.40** Аб'ектыў

### 31 ліпеня, пятніца

**19.00** Аб'ектыў
**19.05** Дакументальная гадзіна: «Сэрца за кратамі», дак. фільм, рэж. Вольга Мікалайчык і Павал Ратамка, 2007 г., Беларусь
**20.00** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў, 5 серыя: «Энэргетычная бяспека»
**20.15** Беларусы ў Польшчы
**20.30** Госць «Белсату»: Павал Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Вітаўт» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** «Дзеці і рыбы», маст. фільм, рэж. Яцак Бромскі, 1997 г., Польшча.
**22.55** Аб'ектыў

### 1 жніўня, субота

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19.05** МакраФон: «Be Free—2008», фестываль, ч. 4: выступ гурта «Ulis»
**19.40** Чалавек-эпоха: «Ісабэль Альендэ», дак. фільм, 2007 г., Нямеччына—Вялікабрытанія.
**20.40** «Бульбаны», мультсерыял
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Міндоўг» (спазнаваўчая праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.10** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**21.40** «Дэтэрмінатар», серыял: 4 серыя




**22.25** Жаўтуха (сатырычная праграма)
**22.50** Аб'ектыў

### 2 жніўня, нядзеля

**19.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**19.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 12 серыя
**20.05** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Пагоня за праўдаю», дак. фільм, рэж. Юрый Каліна, 2002 г., Польшча
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**21.45** Фільматэка майстроў: «Норкі», камедыя, рэж. Ян Гржэбэйк, 1998 г., Чэхія.





# Грунвальд у пер'і

**У мінскім скверы імя Янкі Купалы 15 ліпеня прайшла бітва падушкамі, прысвечаная 599-годдзю Грунвальду.**

Да 20-й гадзіны ля помніка песняру сабралося блізу трохсот маладых людзей. Большасць мела з сабой падушкі, спальнікі, мяккія цацкі, надзіманыя шарыкі. Астатнія хадзілі і шукалі, каб хто пазычыў «зброю».

Андрэй Кім, адзін з ініцыятараў мерапрыемства, растлумачыў правілы ды крыху апавёў пра Грунвальдскую бітву і яе адрозненні ад сённяшняга бою падушкамі. Усе раздзяліліся на дзве часткі: крыжакі і ліцвіны. Была каманда «пачынаць», і з крыкамі «Ура!» і «За радзіму!» каманды панесліся лупіць адна адну падушкамі.

Смех. Крыкі. Пер'е. Пасля першага раўнду пайшла бойка не «крыжакі супраць ліцвінаў», а «кожны сам за сябе». Ды і як ў такім вэрхале разабрацца, хто свой, а хто чужы...

Хлопцы, дзяўчаты, мамы з дзецьмі, паважныя мужчыны і гламурныя дзяўчаты — усе змяшаліся па полі бою. Хлопцы вышуквалі ваяра памацней і адзін на адзін махаліся «зброяй». Дзяўчаты часцей каапераваліся і нападалі гуртам. А дзеці найбольш між сабой «ваявалі». Праўда, адзін хлопчык-ліцвін гадоў шасці меў шыкоўную тактыку. Выбіраў дарослага суперніка, занятага бойкай, падбягаў і біў падушкай пад калені. І крыжак валіўся на зямлю як падкошаны.

Разыходзіцца, праўда, давялося без пары. Да Кіма падышоў супрацоўнік КДБ і папярэдзіў: «Час скончыўся, разыходзьцеся, а то зараз нашыя байцы прыедуць, і пачнецца зусім іншая бойка».

Андрэй Кім тлумачыць сутнасць ідэі: «Ёсць міжнародны рух бітвы падушкамі «Make feathers not war» (Біцеся падушкамі, а не ваюйце). Мы любім нашую гісторыю, але яшчэ любім жарты, пазітыў — тое, чаго не стае нашай краіне. Мэта нашай задумы — павесяліцца. А адначасова — нагадаць, што ў нас слаўная гісторыя».

**Настасся Шамрэй**

# Змова манархістаў

ЛЕВЫМ ВОКАМ



**Да вечару Імперыя будзе адноўленая ў межах Ленінскага раёну. Фельетон Лёліка Ушкіна.**

— Пароль?

— Жыццё за цара!

— Праходзь.

Чалавек на вуліцы яшчэ раз азірнуўся. Быццам бы хваста няма. Асцярожна праслізнуў за дзверы, прайшоў лабірынтам калідораў, апынуўся ў зале. Адну з яе сценаў цалкам закрывала карціна «Мікалай Другі моліцца за ахвяраў тунгускага метэарыту».

Старшыня паседжання прывітаў госця і пачаў прамову.

— Стогне, рыдае зямля беларуская! Аднак пратэстам супраць аўтарытарнага рэжыму дасюль не хапала агульнай канструктыўнай альтэрнатывы. Цяпер яна знойдзеная: позняя манархія Раманавых. Там было ўсё для ўсіх: фракцыя памяркоўных у парламенце, адносна вольны друк, нікага кантролю за бізнэсам, ніякіх селектарных нарадаў па зборы ўраджаю, ніякага апрычніка Ломаця і прымусовай падпіскі... Лепата! І народ успрыме гэта як чарговы віток лібералізацыі.

Усе дружна заківалі.

— Прыйшоў час рэстаўрацыі! План такі. Заўтра да нас прыедзе імператрыца. І вось гэты сціплы чыноўнік гарвыканкаму (прамоўца кіўнуў у бок госця) бухнецца ёй у ногі і, рыдаючы, ад імя народа паднясе чалабітную. У тую ж хвіліну (спікер кінуў на стол план Гомеля) атрад дырэктараў-карупцыянераў захоплівае вакзал. Атрад канструктыўнай апазіцыі — банк, атрад «шэрых» таксістаў — гарвыканкам. Да вечару Імперыя будзе адноўленая як мінімум у межах Ленінскага раёну. Галоўнае — поўная канспірацыя! Ёсць пытанні?..

Пытанняў не было. Старшыня ўзняўся, перахрысціўся і загугнявіў «Божа, цара храні».

Зранку ўсё ішло згодна з планам. Інсургенты занялі пазіцыі і, ганяючы на мабілах тэтрыс, чакалі сігналу. Чыноўнік гарвыканкаму з чалабітнай у руках выйшаў на чырвоную дарожку, паўтараючы завучаны тэкст. Як толькі Наталля Раманава пад'ехала да будынку, ён, штурхаючы суседзяў, падаўся наперад.

Ружовыя малюнкі заўтрашняй квітнеючай манархічнай Беларусі паўставалі перад яго вачыма. Вось ён — на той момант ужо нейкі віконт Смаргонскі — выходзіць у горад. Шыкарныя мадам у капялюшыках з вуалямі шпацыруюць па бульвары з сабачкамі. Казакі ганяюць нагайкамі падлеткаў з улёткамі. Працоўныя пруцца ў кабак. Прайшлі два лібералы — дэпутаты Думы прадстаўнікоў. Яны гучна абмяркоўвалі выступ дэпутата Мілінкевіча наконт Антанты. Віконт Смаргонскі хацеў таксама ўставіць слоўца ў паленіку, аднак не паспеў. З-за рогу вуліцы Вялікадзяржаўнай вылецела банда байкераў-бамбістаў. Наперадзе ехаў чалавек без шлему...

Чыноўнік вярнуўся ў рэал.

Замест таго каб даць сігнал да паўстання, клерк проста даў Раманавай буську ў тлустую потную руку.

Так правалілася манархісцкая змова.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАННІ

**Сябры віцебскага аддзялення СБП** сардэчна віншуюць з юбілеем свайго калегу, мужнага чалавека і грамадзяніна Пятра Ламана і жадаюць яму новых творчых поспехаў у паэзіі і на тэатральнай сцэне.

### ШКОЛКІ

**Вілейка.** Буду ўдзячны за кансультацыю чытачам з Вілейкі — ці ёсць у горадзе беларускі клас для першакласніцы? Ці адно толькі ў Маладзечне? lel1967@yandex.by

**23-я гімназія.** Запрашаем ахвотных у 7-Б клас 23-й беларускай гімназіі Мінску.

### ДЭКАРАТЫЎНЫЯ ТРУСЯНЯТЫ

**Прадаем** маленькіх дэкаратыўных трусянят. Т.: (029) 577-78-07, (029) 677-29-34

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Пецярбург.** Жонку таварыша міністра чыгунак, за тое, што збіла свайго слугу і лёкая, — засудзілі на дзесяць дзён адседкі.

**«Наша Ніва». №27. 1909**

## АНЕКДОТЫ

Паступайце ў педагагічныя ВНУ! Прафесія настаўніка дае вам і вашым родным пажыццёвую гарантыю ад выкрадання з мэтай выкупу!

* * *

Эх, вось каб усталяваць у свеце татальную справядлівасць — усё падзяліць пароўну. Але толькі так, каб дзяліць самому, — так будзе надзейней.

* * *

Калі набраць на дамафоне *100#, ён пакажа, колькі ў хаце грошай.

## З ПАЧУТАГА

### Да казлоў

Па дарозе з Докшыц на Глыбокае ёсць вёска Казлы. Стаяць у Докшыцах дзве маладыя прыгожыя дзяўчыны, «галасуюць». Спыняецца аўто, кіроўца пытае:

— Куды вам, дзяўчаты?

— Падвязіце нас да Казлоў.

Едуць, на паўдарозе кіроўца не вытрымлівае:

— І чаму вы, такія прыгожыя дзяўчаты, не можаце сабе нармальных мальцаў знайсці?

### Камары ці вошы

Размаўляюць два знаёмыя з суседніх вёсак, Франак і Сымон. Сымон пасе калгасных кароў, у яго доўгія валасы, якія не ведаюць мыла або шампуню хіба ад часоў распаду СССР.

— Навошта табе такія доўгія валасы? — пытае Франак.

— Каб камары на пасце не кусалі.

— А што, хіба вошы лепей?

**Зміцер Лупач, Глыбокае**

**Наша Ніва**
незалежная газета
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф-рэдактар | Андрэй Дынько |
| галоўны рэдактар | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

©**НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6065. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 21.07.2009.
Замова № 3934.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.
Цана дамоўная.
ISSN 1819-1614
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12